PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 26 (2459) Год XLVIII | Беласток, 29 чэрвеня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Падлічылі нас

Галоўная статыстычная ўправа абнародавала ўступны рапарт вынікаў праведзенага ў леташніх маі і чэрвені агульнапольскага перапісу насельніцтва, кватэр і сельскай гаспадаркі. Паколькі яшчэ не апублікаваны падрабязнасці, рана займацца нейкімі аналітычнымі высновамі. Усё ж такі варта прывесці найцікавейшыя лікі.

Насельніцтва Польшчы ў 2002 годзе налічвала 38 230,1 тысячы чалавек, а гэта на 351 тысячу больш, чым паказаў папярэдні перапіс з 1988 года. З гэтага ліку прыналежнасць да польскай нацыянальнасці вызначыла 36 983,7 тысячы (96,74%), да іншай чым польская — 471,5 тысячы (1,23%) і зусім не назвала сваёй нацыянальнасці 774,9 тысячы чалавек (2,03%). З меншасцей найбольш назвала сябе сілезцамі (173,2 тыс.) і немцамі (152,9 тыс.). Да беларускай нацыянальнасці прызналася 48,7 тыс. чалавек. Іншыя нацыянальнасці: украінцы — 31,0 тыс., ромы — 12,9 тыс., расейцы — 6,1 тыс., лэмкі — 5,9 тыс., літоўцы — 5,8 тыс., кашубы — 5,1 тыс.; паўтысячы назвала сябе татарамі. У 4,5 тысячы выпадкаў асоб з няпольскай нацыянальнасцю нельга было ўстанавіць іхнюю. Найбольш асоб з іншай, чым польская, нацыянальнасцю пражывае ў Сілезскім (186,3 тысячы — 3,9% насельніцтва ваяводства), Апольскім (133,3 тысячы — 12,5%) і Падляшскім (55,2 тысячы — 4,6%) ваяводствах. У сямейных размовах мовай іншай чым польская карыстаецца 563,5 тысячы чалавек, з чаго нямецкай мовай 204,6 тысячы і англійскай 89,9 тысячы. Пра іншыя мовы рапарт не згадвае.

З 775,3 тысячы асоб народжаных па-за межамі сённяшняй Польшчы 104,5 тысячы нарадзілася на тэрыторыі сённяшняй Беларусі; найбольш іх (17,8 тысячы) пражывае ў Ніжнесілезскім ваяводстве, у Падляшскім — 5,3 тысячы.

У Падляшскім ваяводстве пражывала 1 208,6 тысячы чалавек; з іх ліку 591,2 тысячы мужчын і 617,4 тысячы жанчын. На вёсцы ў нашым ваяводстве жыло 251,3 тысячы мужчын і 245,7 тысячы жанчын — гэта дае найгоршы каэфіцыент у краіне. У Падляшскім ваяводстве найбольшы ў краіне адсотак людзей без пачатковай адукацыі — 6,5%.

У 1988 годзе ў Падляшскім ваяводстве з працы жыло 47,1% насельніцтва, а з пенсій і засілкаў 17,1%; у 2002 годзе з працы ўтрымоўвалася ў нас 33,5% насельніцтва, а з незаробкавых крыніц — 26,6%. Падобныя прапорцыі наглядаюцца па ўсёй краіне.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота Янкі Целушэцкага

Хор „Акварэлі" з Гродна

Свята беларускай культуры ў Беластоку

Янка Целушэцкі

Сёлетняе Свята беларускай культуры ў Беластоку было васемнаццатым такога роду культурна-забаўляльным мерапрыемствам, якое арганізуе Галоўнае праўленне БГКТ. Карыстаецца яно вялікай папулярнасцю жыхароў Беластока і ваколіц. На Свята беларускай культуры прыязджаюць між іншым аматары беларускай музыкі з розных, часамі адлеглых ад цэнтра ваяводства, мясцовасцей. Імпрэзу а трэцяй гадзіне пасля поўдня адкрыў старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі. Паінфармаваў ён пра ролю Свята беларускай культуры ў жыцці беларусаў Беласточчыны і ўсёй краіны. Яно сталася вельмі прэстыжным, на ім хочуць выступіць лепшыя беларускія калектывы.

— Вялікая ахвота самадзейнікаў з нашых гарадоў і вёсак да спеву і да ўдзелу ў канцэртах будзе відавочна шаноўнай публіцы і сёння, — сказаў Ян Сычэўскі. — І гэта павінна нас толькі цешыць. Мы маем што паказаць. У нас многа калектываў, у тым ліку фальклорных, тэатральных, абрадавых. У іх выступае моладзь і старэйшыя. Кожны мае магчымасць развіваць свой талент. Сёння мы запрасілі 35 салістаў, калектываў і хораў. Будуць таксама салісты, аркестр і хор з Гродна.

Старшыня ГП прывітаў дастойных гасцей Свята беларускай культуры, між іншым, пасла Рэспублікі Беларусь у Варшаве Паўла Латушку, сенатара РП Сяргея Плеву, паслоў Сейма Аляксандра Чужа і Яўгена Чыквіна, падляшскага віцэваяводу Ежы Паўяновіча, прадстаўнікоў гарадскіх улад Гродна і Беластока.

Канцэрт распачаўся ад выступлення калектыву „Журавінка" з Пачатковай школы н-р 3 у Бельску-Падляшскім. Затым на сцэну выходзілі лаўрэаты сёлетняга школьнага конкурсу „Беларуская песня" салісткі Агата Гаўрылюк з ПШ н-р 6 у Беластоку і Амелія Горбач з Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Пасля за салісткамі зноў вучнёўскі калектыў — гімназісты з Ягуштова каля Бельска-Падляшскага, „Рамонка" з Ласінкі і „Дзявочыя ноткі" з Бельскага белліцэя.

Далей ужо да канца канцэрта сцэнай завалодалі дарослыя: эстрадныя гурты „Сакрэт" з Міхалова, „Ас" і „Лідэр" з Беластока ды „Прымакі" з Гарадка. „Лідэр" і „Прымакі" былі вымушаны выступаць на біс. Публіка ўпадабала іх музыку і выканаўчую манеру, не адпускала са сцэны.

Каму ж не хацелася паслухаць раз і яшчэ разок песень у выкананні „Рэчанькі" з Козлікаў, „Васілёчкаў" з Бельска-Падляшскага, „Расспяванага Гарадка" з Гарадка, „Лучыны", „Крыніцы" і „Каласкоў" з Беластока. Маюць сваіх паклоннікаў „Арэшкі" з Арэшкава, „Каліна" з Залук, „Тыневічанкі" з Тыневічаў-Вялікіх, „Чыжавяне" з Чыжоў, „Збучанкі" са Збуча, „Красуні" з Краснага Сяла, „Журавінкі" з Агароднічкаў і „Цаглінкі" са Старога Ляўкова. Напэўна доўга будуць помніць слухачы песні ў выкананні хору Гайнаўскага дома культуры і пачаткоўца на музычнай ніве — мужчынскага калектыву „Куранты" з Бельска-Падляшскага пад мастацкім кіраўніцтвам Аліны Кос.

Варта адзначыць, што амаль усе калектывы выступілі ў народных касцюмах. І ўсе фарсіста, шыкоўна. Шматлікія з гуртоў увялі ў свой песенны рэпертуар яшчэ і харэаграфічныя элементы.

[працяг ☞ 2]

Вандалаўстойлівым у Чаромху ☞ 3

„Трамп" мае быць дастаўлены для распараджэння падляшскіх ПКП да 30 верасня будучага года. На Падляшшы ўжо ходзяць тры рэйкавыя аўтобусы. Тым часам кіраўніцтва ПКС, тлумачыўшы ўсё нерэнтабельнасцю, рашылася на ліквідацыю перавозаў на некаторых аўтобусных шляхах у рэгіёне.

Хто дбае, той мае ☞ 3

Нараўчанская школа з'яўляецца чацвёртай у Польшчы з ліку элітарных школ аснашчаных мультымедыйнай апаратурай для вытворчасці і апрацоўкі тэлепраграм, над якімі патранат узяло Польскае тэлебачанне ў паразуменні з Міністэрствам адукацыі і спорту. Такую апаратуру атрымалі дагэтуль толькі ліцэі з Прушча-Гданьскага, Любліна і Варшавы, а школа ў Нараўцы стала першай такой гімназіяй у краіне.

Еўрапеізацыя Беласточчыны ☞ 4

Еўрасаюз дзеля прыстасавання паасобных краін да гэтай супольнасці выдзеліў вялікія сродкі. Каб узяць грошы, трэба аднак сабраць самому каля 20 працэнтаў коштаў кожнай інвестыцыі. Беласточчына са сваёй зруйнаванай вытворчасцю не мае ніякіх магчымасцей выцягнуць такія сродкі з лакальнага рынку. Таму хваля грошай на мадэрнізацыю польскай гаспадаркі традыцыйна затрымаецца на рацэ Вісле.

Гартаючы часопіс „Баявая Ўскалось" ☞ 5

Вельмі сціплыя звесткі пра Анатоля Сумнага (відаць, гэта псеўданім) з дапамогай „Баявой Ускалосі" ўдалося сабраць. У 1944 годзе беластоцкі паэт знаходзіўся ў Берліне. Ён разам з Сяргеем Хмарам, Васілём Вярбінам, Васілём Вірам спрабуе аб'яднаць беларускіх паэтаў у Нямеччыне.

Лагойск над Гайнай ☞ 8

У час вандроўкі па парку ўспамінаем музей старажытнасцей. Заснавалі яго браты Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы пасля 1836 года. У ім знаходзіліся архіў старажытных рукапісаў, калекцыя мастацкіх твораў, багатая бібліятэка.

Небяспечны начны транспарт ☞ 11

Ноччу праз Семяноўку, Гайнаўку і Чаромху возяць чыгункай небяспечныя для здароўя хімікаты. Пасля чыгуначнай аварыі цыстэрнаў з хімікатамі ў Беластоку сталі пускаць яшчэ больш цягнікоў з небяспечнай для здароўя людзей сыравінай праз Семяноўку і Гайнаўку.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Свята беларускай культуры ў Беластоку

Фота НІКІ ПЕЛІПЕЙКАЙТА

Спявае Амелія Горбач — гімназістка з Гайнаўкі

[1 ☞ працяг]

Канцэрт працягваўся больш за тры гадзіны. У тым часе сыпнуў дожджык, але публіка не панікавала, не пакінула сваіх месц на лавачках у беластоцкім гарадскім амфітэатры. Усе чакалі выступлення хору „Акварэлі" ды духавога аркестра з салістамі з Гродна. І пачулі песні ў выкананні акадэмічнага хора, з вялікай падрыхтаванасцю і дакладнасцю да апошняга гуку. Дырыжыравала ім Марына Петухова.

Аркестра гродзенскіх пажарнікаў слухаў я пару гадоў таму ў Войшках, дзе здавалі якраз у карыстанне дэпо. Кіраўнік яго Вячаслаў Матук. У Беластоку пад яго акампанемент спявалі салісты, сярод іх Марына Шапавал. Выступілі салісты-трубачы. Ад выступлення аркестра што ні кажы самыя добрыя ўражанні. Быў гэта моцны развітальны акорд канцэрта.

На заканчэнне ўсе выканаўцы праспявалі пад дырыжорствам Алы Каменскай песню „Люблю наш край".

А за сцэнай збіраліся дадому беластоцкія літаратары „белавежцы", якія падчас Свята падпісвалі свае кніжкі. Між іншым Міра Лукша давала аўтограф у сваіх „Wierszach tutejszych". Складалі, не распраданыя да апошняга, свае вырабы гродзенскія і беластоцкія народныя рукадзельнікі. Шмат касет прадалі „Прымакі" з Гарадка. Проста з самахода, якім прыехалі і якога не ўкралі, аб чым апавясцілі са сцэны публіцы.

Янка Целушэцкі

Памёр Васіль Быкаў

22 чэрвеня 2003 г., пасля цяжкой хваробы адышоў з жыцця вялікі беларускі пісьменнік і грамадзянін Васіль Быкаў.

Пісьменнік нарадзіўся 19 чэрвеня 1924 г. у вёсцы Бычкі Віцебскай вобласці. У час II сусветнай вайны ў радах Чырвонай Арміі ваяваў на тэрыторыі Румыніі, Балгарыі, Венгрыі, Югаславіі і Аўстрыі.

Першыя творы Васіля Быкава апублікаваны былі ў 1947 г., аднак творчая біяграфія пісьменніка пачалася ў 1951 г. з расказаў, героямі якіх сталі салдаты і афіцэры, што акрэсліла далейшую тэматыку яго творчасці. Вядомасць пісьменніку прынесла аповесць „Трэцяя ракета", напісаная ў 1962 г. Чарговыя аповесці „Альпійская балада" (1964), „Сотнікаў. Абеліск" (1972), „Пайсці і не вярнуцца" (1979), „Мёртвым не баліць" (1989), „Дажыць да світання" (1990) паставілі яго ў адзін цэраг з выдатнымі майстрамі ваеннай прозы XX стагоддзя. У іх аўтар абараняў праўду аб вайне перад фальсіфікатарамі гісторыі, за што падвяргаўся крытыцы ў дзяржаўным друку.

Некалькі апошніх гадоў пісьменнік жыў за мяжой — спачатку ў Фінляндыі, потым у Нямеччыне, а з 2002 г. — у Чэхіі. Сёлета ў красавіку пісьменьніку была зроблена анкалагічная аперацыя ў Празе. Апошнія тыдні Быкаў лекаваўся ў Беларусі, у анкалагічнай клініцы ў Бараўлянах.

(вл)

Змрочная перспектыва

Тое, што Беларусь, а дакладней яе кіраўніцтва знаходзіцца ў палітычнай самаізаляцыі — вядома ўжо даўно. Можна толькі здзіўляцца вялікаму жаданню трымаючых уладу нанесці ўрон аўтарытэту і іміджу роднай краіны, спадзяючыся ўзамен атрымаць большую падтрымку ўласнага насельніцтва. Але і ў гэтым накірунку цяперашнія беларускія ўлады трапілі ў сабою расстаўленую пастку.

Аб тым, што ўнутраная палітыка дзяржавы накіраваная на паляпшэнне дабрабыту простага люду, з высокіх трыбун казалася неаднойчы і заўзята. Ідучы да ўлады, сённяшні беларускі прэзідэнт кляўся і бажыўся, што не дасць у крыўду маламаёмных і сацыяльна слаба абароненых слаёў грамадства. Асаблівы гнеў і маланкі кідаліся ў бок „вшивых блох" — прадпрымальнікаў, якія, нібыта, як крывасмокі паселі на дзяржаўнае цела, не даючы жыць звычайнаму рабочаму, калгаснику і пенсіянеру.

Гарантаваная роўнасць у беднасці знайшла выдатную глебу ў яшчэ не астыўшых ад камуністычнага ачмурэння галовах саветскіх беларусаў. І вынік не прымусіў доўга сябе чакаць. „Сацыяльна арыентаваная рынкавая эканоміка" крок за крокам змяншала мэтазгоднасць праяўлення прыватнай ініцыятывы, а потым і вартасць аб'яднання ў арганізацыі з мэтай адстойвання сваіх правоў.

Цяперашнія беларускія палітычныя партыі знаходзяцца, па вялікаму рахунку, у зародкавым стане. Яны больш нагадваюць групы аб'яднаных дысідэнтаў, таму і апынуліся на перыферыі беларускай палітыкі. На рознастайныя няўрадавыя арганізацыі апошнім часам пачаўся моцны ціск з мэтай закрыцця. Пра вайну ўлады са свабодай слова і незалежнымі выданнямі канстатуюць праваабарончыя і журналісцкія арганізацыі як Беларусі, так і замежжа. Але ўсё гэта не надта цікава „простаму чалавеку", для якога галоўнае, каб была „чарка і шкварка", пра што і клапоціцца „сацыяльна арыентаваная" эканоміка.

Аднак і тут, відаць, хутка ўзнікне сур'ёзная праблема. Бо ў сучаснай сусветнай супольнасці павага з боку ўлады да правоў і свабод сваіх грамадзян, а асабліва іх аб'яднанняў ёсць адным з асноўных чынникаў узаемадачыненняў. А менавіта прынцып свабоды грамадзян аб'ядноўвацца ў прафесійныя саюзы парушыў беларускі ўрад. Так сцвярджаюць шэраг беларускіх прафсаюзаў, якія і склалі адпаведную скаргу ў Міжнародную арганізацыю працы (МАП). І гэтая скарга стала прадметам абмеркавання на 91-й канферэнцыі арганізацыі, якая прайшла ў Жэневе ў сярэдзіне чэрвеня. Па выніках абмеркавання было канстатавана, што ўрад Беларусі не прыслухоўваецца да рэкамендацый МАП і не спрабуе выправіць сітуацыю, спыніўшы парушэнні. Больш таго, па словах беларускай неафіцыйнай прафсаюзнай арганізацыі, становішча ў гэтым дачыненні апошнім часам значна пагоршылася. Асабліва зневажаючым права грамадзян на свабоду аб'яднання стала адкрытая заява Аляксандра Лукашэнкі аб тым, што прафсаюзы павінны быць уключаны ў лік дзяржаўных устаноў. На практыцы гэта амаль рэалізавана — Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі стала, па сутнасці, марыянеткавай арганізацыяй выканаўчай улады. Дэмакратычныя ж прафсаюзы пастаянна знаходзяцца пад такім ціскам, што не могуць нармальна выконваць свае функцыі і больш занятыя палітычна-юрыдычнай барацьбой за выжыванне.

У выніку разгляду беларускай сітуацыі амаль усе прадстаўнікі прафсаюзаў, наймальнікаў і ўрадаў іншых дзяржаў, што ўваходзяць у МАП, прагаласавалі за ўнясенне Беларусі ў так званы „спецпараграф". Сэнс яго ў тым, што Міжнародная арганізацыя працы не раіць наладжваць стасункі з краінай з-за грубага парушэння там урадам правоў працоўных і прафсаюзаў. Цяпер беларускае кіраўніцтва кожныя паўгода мусіць даваць МАП справаздачу пра ліквідацыю выяўленых парушэнняў. Калі ж сітуацыя не палепшыцца, то, як паведаміў старшыня рэспубліканскага прафсаюза радыёэлектроннай прамысловасці Генадзь Фядыніч, „верагодна, група грамадзян звернецца ў Адміністрацыйны савет МАП з патрабаваннем уключыць Беларусь у параграф № 26". А гэта, у сваю чаргу, азначае разрыў у палітыцы сацыяльнага партнёрства з данай краінай. Будзе спынена праца місіі МАП у Беларусі, а замест яе прыедуць тры эксперты-юрысты, якія і будуць на месцы ўсё правяраць. Такое было ў гісторыі толькі пяць разоў і, зразумела, адбілася не толькі на іміджы той ці іншай дзяржавы-парушальніцы, але і на яе эканоміцы.

Ну а ці адбудзецца такое насамрэч у Беларусі залежыць толькі ад паводзін улады. Бо ніхто і нішто не можа перашкодзіць ёй паступаць паводле ўласнага заканадаўства, а не парушаць яго.

Уладзімір Лапцэвіч

Атака на Сычэўскага

Клуб радных у Падляшскім сеймику Лігі польскіх сем'яў (LPR) атакаваў члена ваяводскай управы Яна Сычэўскага, старшыню Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Найбольш актыўны радны LPR Зэнон Дзедзіц абцінаваціў яго ў „выкарыстоўванні пасады для *uprawiania polityki nacjonalistycznej*". Справа ў выказванні члена ўправы, у якім успомніў ён тое (прыводжу за радным Дзедзіцам), што Ліга *szermuje* лозунгам „Polska dla Polaków". У інтэрпеляцыі, якая на жаданне самаўрадаўца LPR апынулася поўнасцю ў пратаколе з сесіі (на памяць патомным?), у час якое прагучала, Зэнон Дзедзіц сцвярджае, што „«Польшча для палякаў» як заклік ніколі не меў нацыяналістычнай афарбоўкі, а толькі сучасная рэжысура чужых па нацыянальнасці прафануе гэту пазітыўную думку". І далей: „Калі карыстаемся лозунгам «Польшча для палякаў», то заўсёды ў добра разуметым духу службы ўсім пражываючым на нашай тэрыторыі. І якраз адтуль у самаўрадавых выбарах выйшлі мы з лозунгам «У Польшчы гаспадар — паляк»". Цікавыя таксама вылічэнні (не былі яшчэ агучаны вынікі перапісу) раднага Дзедзіца, якія прадстаўлены ў інтэрпеляцыі адносна нацыянальнай структуры Падляшскага ваяводства. Паводле яго, на 1 мільён 500 тысяч жыхароў рэгіёна, 1 мільён 400 тысяч гэта палякі. Не тлумачыць ён, адкуль узяліся такія даныя.

У час апошняй сесіі Ян Сычэўскі аднёсся да гэтай напасці. Яго абшырнае выступленне, на жаль, прагучала пад канец сесіі, калі журналісты мусілі ўжо вярнуцца ў свае рэдакцыі, каб паспець напісаць свае тэксты да закрыцця нумароў газет. Так, вось, выступленне Яна Сычэўскага не мела шанцаў на гэтак званы медыяльны прабой. У размове з „Нівай" сказаў ён:

— Не хачу станавіцца ў ролі абвінавачанага, бо не пачуваюся такім. Тое, аднак, што вырабляе радны Дзедзіц, гэта не што іншае, як паскудная нацыяналістычная правакацыя. Пан радны Дзедзіц прапаведвае лозунг „Polska dla Polaków" як быццам бы не нацыяналістычны, а выбітна патрыятычны, з чым я не магу пагадзіцца і не можа пагадзіцца кожны грамадзянін Польшчы, які належыць да беларускае меншасці, які ведае нехвалебнае мінулае ў адносінах паміж польскай і беларускай нацыянальнасцямі, дзе такія лозунгі падымалі тыя, хто дапускаўся нават забойстваў.

Папрошаны даць каментар старшыня сеймика, а адначасова шэф клуба кіруючага ваяводствам СЛД Збігнеў Кшывіцкі сказаў „Ніве":

— Закіды Дзедзіца кур'ёзныя і абсалютна абсурдныя.

І дадаў:

— Гэта не спадар Ян Сычэўскі пачынае на сесіях уздыманне такіх пытанняў, а нават, як член управы, у гэтых справах вельмі памяркоўны. Затое пан Дзедзіц што і руш спрабуе ў гэтай тэматыцы штосьці ўкінуць. Хопіць прыгадаць не такія даўнія ягоныя выказванні наконт Асяродка культур і народаў „Пагранічча" ў Сейнах, якія мелі ясна антысеміцкія матывы. Наш клуб заўсёды адназначна выказваецца і будзе выказвацца ў падобных выпадках.

Цяжка пакінуць гэту справу без каментара. Думаю, што маю на гэта права, асабліва як паляк які піша ў беларускую „Ніву" і які лічыць беларусаў сябрамі, а перш за ўсё грамадзянамі Польшчы і жыхарамі такімі як і я сам. Не ўмею, аднак, знайсці адпаведных слоў каментара. Не першыя гэта спробы напасці на нацыянальныя меншасці, выказваныя вуснамі пана раднага Дзедзіца. Раней жарсна клеймаваў ён г.зв. жыдоўскую і нямецкую праблему. Цяпер прыйшла пара на беларусаў. Выдуманай прычынай было адно з выступленняў спадара Яна Сычэўскага. Выказванні і дзейнасць Зэнона Дзедзіца ў гэтай матэрыі проста гадкія. Магу прасіць толькі ў іншых палякаў байкот таго пана і яму падобных, паказанне яму (і ім) месца на абочыне публічнага жыцця. Карацей: такім людзям нават рукі не падаецца.

Мацей Халадоўскі

Вандалаўстойлівым у Чаромху

Сучасны рэйкавы аўтобус „Трамп" мае хадзіць на шляху Беласток — Чаромха. Дамову аб яго закупцы падпісала ўправа Падляшскага ваяводства з дырэкцыяй Познаньскага прадпрыемства рамонту чыгуначнага рухомага саставу.

Нізкападлогавы, адначленны аўтобус з рухавіком унутранага згарання каштуе каля 2,6 мільёна злотых. Кошт праезду — на 30% таннейшы, чым звычайнымі цягнікамі. Купэ абсталявана вентыляцыяй і абаграваннем. Выдзелена месца на інвалідную каляску і туалет з г.зв. закрытым зваротам, значыць, нечыстоты не будуць выкідваны ў час язды на пуці. Падарожнічаць на ім можа 90 асоб, сярод іх 44 — седзячы. Пры пабудове аўтобуса выкарыстоўваюцца матэрыялы, дзякуючы якім можна справіцца з малюнкамі графіці. Аўтобус — „вандалаўстойлівы". Сядзенні маюць спецыяльныя забеспячэнні ад спробы знішчэння, напрыклад, ад парэзаў нажамі — унутры сядзенняў устаўлены спецыяльныя металёвыя кальчугі. Рухавікі змяншаюць выдзяленне шкодных забруджванняў, значыць, ён — экалагічны. Як пераконваў у Беластоку ў час прэзентацыі „Трампа" прадстаўнік познаньскага прадпрыемства, абслугоўваць можа яго выключна машыніст. Дзякуючы маніторам, якія знаходзяцца ў яго на пульце, машыніст можа назіраць за тым, што адбываецца ў апошняй частцы аўтобуса.

Член управы Падляшскага самаўрада Ян Камінскі заявіў, што да канца кадэнцыі ваяводскага самаўрада будзе закуплены прынамсі яшчэ адзін такі аўтобус. У сваю чаргу Чэслаў Суліма з Падляшскай дырэкцыі пасажырскіх перавозаў ПКП прызнаўся, што ў сувязі з неабходнасцю ліквідацыі некаторых рэгіянальных цягнікоў (агулам каля 20) былі б патрэбны дзве-тры такія машыны. Пералічыў у першую чаргу шляхі Чаромха — Гайнаўка, Гайнаўка — Седльцы і Саколка — Сувалкі. У ваяводствах, у якіх ужо ездзяць познаньскія рэйкавыя аўтобусы, улады пры іх закупцы карыстаюцца грашыма з еўрасаюзных сродкаў на экалогію. На думку Яна Камінскага, таксама на Падляшшы маем такую магчымасць.

— Такія аўтобусы гэта будучыня рэгіянальных перавозаў, — сцвердзіў Чэслаў Суліма.

— Хоць гэта аўтобус са стандартам другога класа цягніка, фактычна, можа ён і не бізнесклас, але, паглядзеўшы, дык і першы клас, — дадаў Ян Камінскі.

„Трамп" мае быць дастаўлены ў распараджэнне падляшскіх ПКП да 30 верасня будучага года. На Падляшшы ўжо ходзяць тры рэйкавыя аўтобусы. Тым часам ПКС, тлумачыўшы ўсё нерэнтабельнасцю, рашыліся на ліквідацыю перавозаў на некаторых аўтобусных шляхах у рэгіёне.

— Найчасцей змяншаем лік тых пераездаў, дзе было найменш пасажыраў. Гэта датычыла перш за ўсё аўтобусаў, якія курсіруюць да поўдня, да 13^{30}, — тлумачыць Ян Бароўскі, дырэктар ПКС у Беластоку.

Між іншым, менш будзе аўтобусаў на шляху Беласток — Супрасль і на адзін на адрэзку Беласток — Гарадок ды Беласток — Крынкі. На некаторых шляхах скарочаны курсы. Для прыкладу, аўтобус Беласток — Бельск-Падляшскі — Браньск кончыць дарогу ў Бельску. Больш аўтобусаў не будзе хадзіць у свабодныя ад працы дні. Аб паправе якасці перавозаў беластоцкая дырэкцыя маўчыць. Можна, значыць, спадзявацца, што ў гэтым плане нічога не зменіцца і далей, для прыкладу, на шляху ў Бельск танней, камфартабельней і хутчэй будуць вазіць пасажыраў прыватныя транспартныя фірмы. (холм)

Хто дбае, той мае

15 чэрвеня г.г. Гімназія імя Тамары Саланевіч у Нараўцы атрымала ад Польскага тэлебачання аснашчэнне мультымедыйнай майстэрні. У мерапрыемстве прысутнічалі паслы Сейма Рэчы Паспалітай Барбара Цірук і Аляксандр Чуж, удзельніца Краёвай рады радыёвяшчання і тэлебачання Славаміра Лазінская, прэзас Польскага тэлебачання Роберт Кваткоўскі, куратар Падляшскай кураторыі асветы Зофія Транцыгер-Кочук, загадчык Тэлевізійнай акадэміі Януш Целішак і іншыя.

Роберт Кваткоўскі выказаў меркаванне, што даючы школе навейшае аснашчэнне Польскае публічнае тэлебачанне будзе добра служыць маладым людзям і створыць ім шанс выяўлення сваіх талентаў. Прыгадаў ён і Тамару Саланевіч, што яна была добраю душою для мерапрыемства, звязваючы Польскае тэлебачанне з Нараўкай. Выказаў ён таксама спадзяванне, што нараўчанскія вучні змогуць знаёміцца з вытворчасцю тэлепраграм у Беластоцкім тэлецэнтры.

Януш Целішак паведаміў, што Тэлевізійная акадэмія вывучыла каля 3,5 тысяч працаўнікоў тэлебачання і памежных галін, у іх ліку найвыдатнейшых зорак медыяў. З гэтага дня і вучні школы імя Тамары Саланевіч будуць ахоплены гэтым навучаннем. Школа атрымае падручнікі для мультымедыйнай адукацыі, будзе забяспечана курсамі і магчымасцю практычнага знаямлення з прадукцыяй тэлепраграм. Да таго ж яшчэ аўтары тэлевізійных праграм будуць цікавіцца іх ацэнкамі ды заўвагамі і падказкамі вучняў. Януш Целішак перадаў школе бібліі- і фільматэку для новай мультымедыйнай майстэрні.

Нараўчанская школа з'яўляецца чацвёртай у Польшчы з ліку элітарных школ аснашчаных мультымедыйнай апаратурай для вытворчасці і апрацоўкі тэлепраграм, над якімі патранат узяло Польскае тэлебачанне ў паразуменні з Міністэрствам адукацыі і спорту. Такую апаратуру атрымалі дагэтуль толькі ліцэі з Прушчагданьскага, Любліна і Варшавы, а школа ў Нараўцы стала першай такой гімназіяй у краіне. У складзе мультымедыйнага камплекта ёсць м.інш. лічбавая відэакамера, інтэрнэт-камера, магнітавід і камп'ютэр для апрацоўкі відэафільмаў.

Як мне паведамілі дырэктар школы Яўген Валкавыцкі і ягоны намеснік Мікалай Герасімюк, немалаважную ролю ў справе сыграла тое, што заступніцай гімназіі з'яўляецца былая журналістка Польскага тэлебачання Тамара Саланевіч. Галоўнай хадайніцай за прызначэннем навейшай апаратуры ў Нараўку была падляшская дэпутатка Сейма Барбара Цірук, журналістка Беластоцкага тэлецэнтра, знаёмая і з пакойнай Тамарай Саланевіч, і з прэзасам Робертам Кваткоўскім.

Заняткі ў новай майстэрні будуць праводзіцца ў рамках пазаўрочных заняткаў па інфарматыцы; для іх вядзення прыгатаваны ў школе траіх настаўнікаў. У мультымедыйнай майстэрні будуць займацца вучні з шостага класа пачатковай школы і першага класа гімназіі — каб маглі вывучаць тэлевытворчы працэс прынамсі тры гады. Будуць яны запісваць у камп'ютэр школьныя мерапрыемствы, а пасля апрацоўваць запісы для школьнай відэатэкі.

У нараўчанскай школе працуюць ужо дзве камп'ютэрныя майстэрні, камп'ютэры ёсць у школьнай бібліятэцы і чытальнай зале ды ў настаўніцкім пакоі. Усе настаўнікі азнаёмлены з прафесійным карыстаннем камп'ютэрамі; м.інш. у гэтым годзе школьныя пасведчанні ў Нараўцы будуць выпушчаны з гэтых машын. Навучаннем інфарматыкі ахоплены ўжо вучні пачатковых (I-III) класаў — адна гадзіна ў тыдзень у рамках інтэграванай адукацыі. А з чацвёртага класа пачатковай школы пачынаецца навучанне інфарматыкі як прадмета. З новага школьнага года будуць ім ахоплены ўсе вучні з гміны, бо ў школах у Старым Ляўкове і Семяноўцы астаюцца адно пачатковыя класы, а апошнія вучні будуць прадаўжаць навуку ў сучасна абсталяванай школе ў Нараўцы.

Нараўчанская гімназія імя Тамары Саланевіч размашыста ўступае ў новае тысячагоддзе. Вялікая заслуга ў гэтым і беластоцкіх хадайнікаў, і варшаўскіх вырашальнікаў. Але найбольшая, як мне паказалася, была праца мясцовых эліт — кіраўніцтва гміны і дырэкцыі школы — для сваёй „Малой Айчыны". Прысваенне імені сваёй зямлячкі гімназіі і шматгранная ў ёй адукацыя стварылі падставы для хадайніцтва за прызнанне Нараўчанскай гміны і яе асветных поспехаў у шырэйшым маштабе. І найбольш кемлівыя маладыя людзі выйдуць у свет не адно са школьным пасведчаннем, але і — на практыцы — з цікавай і важнай у будучыні прафесіяй.

Аляксандр Вярбіцкі

Семяноўка

Добраахвотнай пажарнай камандзе — 50

14 чэрвеня г.г. Добраахвотная пажарная каманда ў Семяноўцы (Гайнаўскі павет) святкавала 50-годдзе сваёй дзейнасці. На ўрачыстасць прыбылі, між іншым, войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч і камендант Павятовай дзяржаўнай пажарнай часці Яраслаў Трахімчык, а таксама жыхары Семяноўкі і суседніх вёсак ды запрошаныя члены добраахвотных пажарных каманд з Альхоўкі, Нараўкі і Старога Ляўкова.

Пра гісторыю ДПК у Семяноўцы расказаў шматгадовы старшыня яе праўлення Славамір Кулеша.

Першым камендантам новастворанай ДПК быў Ян Аніскевіч, яго намеснікамі Ян Шыманюк і Рыгор Матысюк ды сакратаром Ян Кіслы. Каманда складалася з 18 чалавек. У 1955 годзе яна ўжо мела ручную помпу, драбіны і іншае тэхнічнае абсталяванне. Прыбыло добраахвотнікаў. У 1957 годзе ДПК атрымала мотапомпу і спецвопратку неабходную пры тушэнні пажараў. Як вядома, яшчэ ў сямідзесятыя гады шмат будынкаў было пакрытых саломай. Часта здараліся пажары. У 1959 годзе загарэліся дамы, хлявы ды стадолы ў суседняй вёсцы Пасекі. Між іншым тады вялікую ахвярнасць у ратаванні сялянскай маёмасці ад агню праявілі семяноўскія пажарнікі і іншыя жыхары гэтай вялікай вёскі.

Члены ДПК вялі г.зв. прафілактычную работу ў вёсках: правяралі каміны і падпашкі ды давалі ўказанні, што трэба паправіць, каб не ўспыхнуў пажар. Старэйшым жыхарам самі дапамагалі ліквідаваць заганы, якія маглі прычыніцца да пажару. Многа працавалі ў грамадскім пачыне пры пабудове школы і святліцы. Ладзілі дахадовыя забавы. Не хто іншы як пажарнікі папрацавалі дзеля таго, каб лепш прыстасаваць для сваіх вогнетушыльных патрэб адгалінаванне Нарвы — Падрэчку. Паглыбілі ды ўзмоцнілі берагі. Павел Шыманюк пабудаваў са свайго матэрыялу гараж у 32 кв. м для самахода, які атрымалі ў 1974 годзе. Купілі трывожную сірэну. Ад 1982 года па сённяшні дзень шафёрам з'яўляецца Міхал Лукша. У 1984 годзе старшынёй праўлення ДПК выбралі Славаміра Кулешу, камендантам — Юрыя Аніскевіча, сакратаром — Міхала Лукшу і скарбнікам — Мікалая Панькоўскага.

ДПК налічвае 32 асобы. У 1999 г. пачалі пабудову прасторнага дэпо, якое 14 чэрвеня г.г. урачыста перадалі ў карыстанне. Пажарнікам-добраахвотнікам ва ўсім дапамагаюць гмінныя ўлады. Падчас урачыстага святкавання юбілею новае дэпо і самаход пасвяцілі ксёндз Войцех Красніцкі з Нараўкі і настаяцель Семяноўскага прыхода Мікалай Шабелян.

Членам семяноўскай ДПК уручылі ўзнагароды: медалі, значкі і рэчавыя ўзнагароды. Залатыя медалі „За заслугі для пажарнай справы" атрымалі Павел Шыманюк, Юрка Кіслы, Ян Аніскевіч, Уладзімір Русакоў, Ян Аліхвер. Сярэбраныя медалі атрымалі: Мікалай Панькоўскі, Андрэй Лешчук. Узнагароджаных было пару дзесяткаў асоб. Ад імя ўзнагароджаных падзякаваў Юрка Кіслы.

Пасля афіцыйнай часткі адбылася мастацкая. На сцэне пры дэпо выступіў вакальна-танцавальны калектыў „Душкі з пушкі" з Пачатковай школы ў Нараўцы. Затым пажарнікі запрасілі гасцей на супольны пачастунак. Вечарам усе гулялі пад гукі гармоніка ля вогнішча. Было таксама пячэнне кілбасак. Слаўнае было свята.

Янка Целушэцкі

Еўрапеізацыя Беласточчыны

Першыя тыдні пасля еўрапейскага рэферэндуму мінулі ў Польшчы цалкам нармальна. Прэм'ер-міністр Лешак Мілер адклікаў усе свае ранейшыя абяцанні пра датэрміновыя выбары, ініцыяваў у Сейме спектакль пад загалоўкам „парламенцкая большасць падтрымлівае ўрад". Палітыкі заняліся сабою, адны адных абвінавачваюць, але ніхто ўжо нават не апраўдваецца. Найбольшае адхіленне ад этычных норм не выклікае ніякіх паслядоўнасцей. Нават шляхта ў XVII стагоддзі была менш разбэшчана чым сучасныя грамадскія эліты. Карупцыя дасягнула такіх маштабаў, што нават каталіцкія епіскапы вырашылі прыняць спецыяльную пастанову ў гэтай справе, заклікаючы стрымаць шаленства расцягвання публічнай маёмасці.

На беластоцкіх царыкаў і іх лакальныя праблемы ніхто ў Польшчы нават не звяртае ўвагу. А праблемы, якія ўзнікнуць неўзабаве пасля ўваходу краіны ў структуры Еўрапейскага саюза будуць тут немалыя, але, пакуль што, ніхто пра іх не думае. Еўрасаюз дзеля прыстасавання паасобных краін да гэтай супольнасці выдзеліў вялікія сродкі. Каб узяць грошы трэба аднак сабраць самому каля 20 працэнтаў коштаў кожнай інвестыцыі. Беласточчына са сваёй зруйнаванай вытворчасцю не мае ніякіх магчымасцей выцягнуць такія сродкі з лакальнага рынку. Таму хваля грошай на мадэрнізацыю польскай гаспадаркі традыцыйна затрымаецца на рацэ Вісле. Так было ў пачатку дзевяностых гадоў, калі еўрапейскі, і не толькі еўрапейскі, капітал шукаў партнёраў дзеля супольнага інвеставання. Тады аднак накіраваная Беларускім дэмакратычным аб'яднаннем у адрас гмінных улад ва ўсходняй Беласточчыне прапанова выкарыстання гэтых сродкаў была рашуча адкінута як надта рызыкоўная і падазроная. Пры ўладзе было пакаленне з доўгай стажыроўкай у радах камуністычнай партыі, якое не магло адарвацца ад логікі старой сістэмы. Сёння ўладу ў краіне, але таксама на Беласточчыне, часцей трымаюць былыя дзеячы польскага адпаведніка Камсамола — Саюза сацыялістычнай моладзі. Іх падыход да гаспадарчых праблем вельмі падобны да падыходу старэйшых таварышаў, а праблемы грамадства ім цалкам абыякавыя.

Найгоршае, што няма ніякай альтэрнатывы для такога стылю кіравання. Раней краінай і ваяводствам кіравалі прафесійныя хрысціяне, але аказаліся яны не менш карумпаванымі і цынічнымі, чым сучасныя эліты ўлады.

Існуе вялікая небяспека, што еўрапеізацыя сістэмы кіравання і гаспадарчага жыцця прыйдзе на Беласточчыну з вялікім спазненнем. Проста няма тут элітаў, якія ўсведамлялі б патрэбу і маштаб неабходных пераўтварэнняў. Кожнае спазненне ў рэфармаванні абазначае толькі тое, што будзем плаціць падаткі, але ўзамен нічога не атрымаем. Пару дзесяткаў тысяч месц працы існуе тут дзякуючы гандлярам з Беларусі, якія купляюць прадукты мясцовай вытворчасці. Закрыццё межаў грамадзянам Беларусі і Расіі, што неўзабаве стане фактам, ліквідуе лакальны рынак і пабольшыць грамадскія праблемы. Танныя візы, ці абяцаныя новыя памежныя пераходы гэта аргументы, якія добрыя былі ў дарэферэндумнай прапагандзе. Візавы рэжым так ці інакш затрымае людзей на абодвух баках мяжы.

Прыстасаванне Беласточчыны да еўрасаюзных стандартаў гэта перш за ўсё перабудова дарог, якімі маглі б вазіць заходнееўрапейскія тавары на ўсход. Адпаведная інфраструктура пры такіх дарогах — гатэлі, бары хуткага абслугоўвання — магла б даць адпаведны прыбытак гэтай частцы Польшчы. Ніякіх іншых вялікіх інвестыцый тут не будзе, таму што няма тут нічога дзеля іх ажыццяўлення. Няма перш за ўсё людзей для абслугоўвання сучасных тэхналогій, інфармацыйных сістэм, падрыхтаваных да супрацоўніцтва ў маштабах шырэйшых чым лакальны рынак. Няма тут таксама капіталу, ні менеджэрскіх кадраў. Вялікі капітал прыйдзе туды, дзе можна хутка яго пабольшыць. На Беласточчыне няма такіх магчымасцей. Гэта правінцыя, адсталая ўжо на дзесяткі гадоў ад багацейшых рэгіёнаў краіны. Нішто не дазваляе прагназаваць, што ў Еўропе гэтая адсталасць будзе паменшвацца.

Практыка Нямеччыны паказвае, што з усходніх ландаў, якія раней былі ў складзе Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, найбольш актыўныя групы грамадства масава перасяляюцца на захад краіны. Цэнтральныя ўлады аб'яднанай Нямеччыны на працягу апошніх дзесяці гадоў правялі на ўсходзе інвестыцыі на суму амаль трохсот мільярдаў долараў. Гэтай сумы аднак было мала, каб выраўнаць адсталасць посткамуністычных правінцый ад астатняй часткі краіны. Сёння ў гарадах усходняй Нямеччыны пустуюць амаль новыя жыллёвыя будынкі. Ніхто не ведае там як паставіцца да гэтай праблемы.

Беласточчыну праўдападобна чакае сіндром усходняй Нямеччыны. Найбольш актыўныя і працавітыя грамадзяне сваю будучыню стануць шукаць за Віслай. Для тутэйшых беларусаў аднак гэта не будзе мець вялікага значэння. Асіміляцыя ўжо амаль вырашыла ўсе нашы нацыянальныя праблемы.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Спалучае нас больш

Я працірaў свае вочы ад здзіву, чытаючы адзін з апошніх нумароў польскага выдання тыднёвіка „Newsweek". Яго пастаянны фельетаніст Мацей Навіцкі, сцэнарыст і аўтар дакументальных фільмаў, які пару гадоў жыў у Францыі, узяўся за разважанні аб выніках уваходу Польшчы ў Еўрасаюз. „Аргумент за ўваходам Польшчы ў ЕС гучыць: калі не скарыстаем гэты шанц, станем чымсьці такім як Беларусь-біс. Жахнутыя гэтай візіяй — кланіраваны Лукашэнка як наш уладар, замардызм, бяда і нацыянальны далікатэс у выглядзе вэнджанага сала ад свята — уцякаем пад апеку Еўрасаюза (...). У сапраўднасці візія Польшчы як Беларусі-біс апіраецца на чыстай дэмагогіі. Польшчу і Беларусь спалучае толькі супольная мяжа і некалькі зруйнаваных гістарычных памятак".

Фактычна, частка еўраэнтузіястаў узняла ў дарэферэндумнай кампаніі г.зв. беларускае пытанне як аргумент дзеля ўваходу Польшчы ў еўрасаюзную супольнасць. Я чуў па беластоцкім тэлебачанні, як нейкая панна ў рэакцыі на маніфестацыю маладых правых еўраскептыкаў выкрыквала: „А што, можа хочаце далучэння да Беларусі?" Гэта, мабыць, дэмагогія, але ў агульным адчуцці, здаецца, паспяховая. Так як удачным бывае палоханне дзяцей ваўком з казкі пра Чырвоную Шапачку ці маланапорыстах, няўдалых ці сканфліктаваных з правам дэпутатаў аб'яўленнем новых выбараў, калі прагаласуюць супраць вотуму даверу ўраду. Беларусь уяўляецца прынамсі значнай частцы палякаў фактычна як краіна замардызму і галечы. З гэтым вэнджаным салам мог бы я палемізаваць, ды аб гэтым менш за ўсё. Можа і так беларускую кулінарыю некаторыя сабе ўяўляюць. Дарэчы, разумею, што для Мацея Навіцкага такі вобраз Беларусі паслужыць меў для збіцця аднаго, у гэтым выпадку, воўчабеларускага аргумента еўраскептыкаў. Аднак не магу знайсці апраўдання для тэзіса аб выключна спалучаючых нашы краіны і народы супольнай мяжы і „некалькіх зруйнаваных гістарычных памятках". Аж не хочацца мне на старонках тыднёвіка „Ніва" рабіць вывады, чаму гэтае сцвярджэнне фельетаніста тыднёвіка „Newsweek" — непаразуменне. Несумненна, Шаноўныя Чытачы самі як з рукава могуць сыпаць дзесяткамі контраргументаў ад гістарычных і міжчалавечых пачаўшы. Вядома, Польшча не стала б Беларуссю-біс, калі б не ўвайшла ў Еўрасаюз, нават, як гэта акрэслівае Мацей Навіцкі, калі б панаваў тут скланіраваны Аляксандр Лукашэнка. Але, я думаю, Польшчу і Беларусь спалучае непараўнальна больш чым Польшчу і выбранку Мацея Навіцкага — Францыю з Версалем трыстагадавой даўнасці без нужнікаў. І не справа ў тым, што няма ў нас карэннай французскай меншасці, якая была б, як беларуская, элементам польскай дзяржаўнасці, і не толькі ў факце, што і беларуская зямля дала Адама Нарушэвіча, Юльяна Нямцэвіча, Станіслава Манюшку, песняра Адама з Міцькаў ці выводзячагася са старой праваслаўнай, беларускай шляхты Тадэвуша Касцюшку. Частка польскай нацыянальнай і дзяржаўнай свядомасці — звязана з Беларуссю, незалежна ад таго, дзе сёння прабягае польска-беларуская мяжа (я не стаўлю яе пад пытанне) і без увагі на тое, наколькі сённяшнія ўлады ў змозе ўтрымаць г.зв. каштоўнасці матэрыяльнай культуры. Такімі выказваннямі, як гэтае Мацея Навіцкага, будуецца непатрэбны мур паміж Польшчай і Беларуссю, які, згодна з намерамі аб уваходзе Польшчы ў ЕС, не можа існаваць; прывесці тут можна выказванні прэм'ера, прэзідэнта ці міністра замежных спраў аб адкрытасці Польшчы на Усход. Рэдактар Навіцкі ўзяўся змагацца з еўраскептыкамі, а праз уласныя вывады аб Беларусі і быццам бы Беларусі-біс сам набраўся еўраскепсісу, прынамсі калі гаворка аб фундаментальных каштоўнасцях, на якія мае апірацца пашыраная еўрапейская супольнасць у адносінах да пазаеўрасаюзных дзяржаў, мабыць, тымчасова па-за яе тэрыторыямі.

Мацей Халадоўскі

„Спаткаймася" ў Аўгуставе

У Аўгуставе над возерам Нецка ад 2 да 4 чэрвеня праходзіла другая частка канферэнцыі „Спаткаймася — нацыянальныя і этнічныя меншасці напярэдадні ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз".

Арганізатары — Рускае культурна-адукацыйнае таварыства і Падляшскі рэгіён таварыства Малады Цэнтр — падрыхтавалі ўдзельнікам сустрэчы даклады, мэтай якіх была інфармацыя аб магчымасцях выкарыстання еўрасаюзных фондаў.

Андрэй Раманчук, старшыня Рускага таварыства, прыблізіў удзельнікам становішча нацыянальных меншасцей у Еўрасаюзе. Аднак рэчаіснасць ідзе ўразрэз з законнымі гарантыямі. Напрыклад, у Нямеччыне найгоршую, чорную работу выконваюць туркі, палякі і рускія. Тое ж дзеецца і ў Бельгіі.

Пацвярджэннем гэтаму быў даклад Алы Самалетавай з Пецярбурга, прадстаўніцы Baltic Research Center на Польшчу, якая гаварыла пра ўспрыманне „рускіх" (усходнікаў) у Польшчы як „дурных, нямытых гандляроў у дрэсах". Грамадзяне Польшчы, на жаль, забылі як 10-15 гадоў таму ездзілі за ўсходнюю мяжу ў гандлёвых мэтах. Падобным чынам успрымаюцца палякі як танная рабочая сіла ў Еўропе. Ала Самалетава паказала стаўленне палякаў да меншасцей і іншых народаў і перасцерагала перад некрытычным успрыманнем ЕС і ўсяго, што заходняе.

Прадстаўнік нямецкай меншасці Пётр Козёл з Аполя прыблізіў праблемы немцаў у Польшчы. На пытанне, чаму да гэтай пары нямецкая меншасць не кантактавалася з меншасцямі Падляшша, адказаў, што прычынай была адсутнасць сапраўднай інфармацыі аб нашым рэгіёне, які на захадзе краіны асацыюецца з рускай мафіяй. Пётр Козёл ужо першага дня развітаўся з крыўднымі для нас міфамі і стэрэатыпамі.

Аб дыскрымінацыі лэмкў, украінцаў ды праблемах з працаўладкаваннем жанчын на Падкарпацці гаварыла Катажына Бубэль з Жэшава.

Вялікім зацікаўленнем удзельнікаў карыстаўся даклад Іаанны Бялас з Фонду супрацоўніцтва з Варшавы, якая прадставіла магчымасці скарыстання меншасцямі праграмы ACCES і новых ініцыятыў і праектаў, накіраваных на развіццё адкрытага грамадства.

Галоўнай праблемай, як заўважылі ўдзельнікі, з'яўляецца малая заангажаванасць і брак ведаў прадстаўнікоў меншасцей аб такіх праграмах. Змяніць гэта могуць такога тыпу канферэнцыі, накіраваныя на супрацоўніцтва маладых людзей.

Паўліна Шафран

Гартаючы часопіс „Баявая Ўскалось”

У кнізе Лявона Юрэвіча „Літаратурны рух на эміграцыі” (Мінск 2002) прачытаў я некалькі радкоў пра паэта з Беласточчыны Анатоля Сумнага (нарадзіўся ў 1912 годзе). З канца 40-х гадоў жыў у Сіднеі (Аўстралія), займаўся грамадскай працаю, быў прыхільнікам Беларускай Цэнтральнай Рады і сябрам літаратурнай сустані „Баявая Ўскалось”.

Сапраўды, сяды-тады пра Анатоля Сумнага згадваецца і на старонках часопіса „Баявая Ўскалось”. Выдаваўся некалі такі часопіс у Заходняй Германіі (1949-1950 гг.), рэдактарам быў Міхась Панькоў. А пасля часопіс выходзіў у г. Таронта (Канада), дзе рэдагаваў яго ўжо Сяргей Хмара. Выйшла ўсяго 18 нумароў.

Дык вось, вельмі сціплыя звесткі пра Анатоля Сумнага (відаць, гэта псеўданім) з дапамогай „Баявой Ускалосі” удалося сабраць. У 1944 годзе беластоцкі паэт знаходзіўся ў Берліне. Ён разам з Сяргеем Хмарам, Васілём Вярбінам, Васілём Вірам спрабуе аб’яднаць беларускіх паэтаў у Нямеччыне. Найперш Анатоль Сумны і яго сябры-паэты падрыхтавалі і вясною 1945 года выдалі літаратурны альманах „Ускалось”. Але англійскія самалёты знішчылі гэтае выданне разам з друкарняю. А паэты раз’ехаліся па розных краінах свету. Так Анатоль Сумны апынуўся аж у Аўстраліі. Ён шчыра сябраваў з Сяргеем Хмарам, нягледзячы на тое, што жылі яны далёка адзін ад аднаго: Хмара — у Таронта, а Сумны — у Сіднеі.

Анатоль Сумны ўваходзіў у рэдкалегію часопіса „Баявая Ўскалось”, перапісваўся з Сяргеем Хмарам. Праўда, сваіх вершаў Сумны друкаваў мала. Мне ўдалося адшукаць толькі адзін, які быў апублікаваны ў № 10 часопіса „Баявая Ўскалось” за 1970 год. Верш мае назву „Маліцьва”, але гэта даволі кволы літаратурны твор-настальгія, твор-просьба і самотны адчай, найперш, па Радзіме. Больш удалай атрымалася першая страфа верша:

Маці сьвятая, заступніца шчырая,
Я Табе душу сваю адчыняю.
Граець у сэрцы цудоўная ліра,
З ёй гэту песьню я сёньня складаю...

Як склаўся лёс Анатоля Сумнага ў Аўстраліі — застаецца загадкай.

Гартаючы часопіс „Баявая Ўскалось” натрапіў я і яшчэ на аднаго малавядомага беластоцкага паэта. Гэта Станіслаў Янушка. Вось што пішацца пра яго ў вышэйзгаданым часопісе: „Беларус з Беласточчыны — Янушка. Маладым ён выпісвае беларускую каталіцкую прэсу, цікавіцца беларусізацыяй. Але кон пакіраваў іначай. Вайна, Польская армія Андэрса, польскае, у тым і сямейнае, асяродзьдзе на эміграцыі зрабілі сваё. А тут яшчэ тагачаснае цкаваньне з боку «ультрапатрыётаў» адсунулі чалавека яшчэ далей. І Янушка замест стацца беларускім паэтам, стае польскім. Выйшла ўжо 2 зборнікі ягоных твораў, падобна гатуецца і трэці. Але паэт не выракаецца, што ён беларускага паходжаньня, не забывае свае мовы і роднае Беласточчыны” („Баявая Ўскалось”, № 14, 1974, с. 8-9).

Станіслаў Янушка пісаў не толькі папольску, але і на роднай мове. Яго вершы друкаваліся на старонках „Баявой Ускалосі”. Яны былі прысвечаны Канадзе, дзе жыў паэт, а таксама пісаў філасофскія вершы-роздумы. Арыгінальнымі атрымліваліся ў паэта і сатырычныя вершы на розныя тэмы:

Жывёлку можна, як вядома:
Карміць і плевай, і саломай,
Бязкарна біць, сячы бічоўцам,
Вясьці, дзе хочам на вяроўцы.
Бо з быдлам хто ж размовы мае?
Найвыжай рыкаць пазвалюяць...

У беларускай прэсе ніколі пра Станіслава Янушку не згадвалася раней. Таму звестак пра яго творчасць і жыццё дужа мала.

Адзін раз напісаў у сваім часопісе Сяргей Хмара яшчэ пра аднаго паэта з Беласточчыны — Віктара Варашыльскага. Але гэты аўтар пісаў па-польску, хоць быў беларусам. Жыў Віктар Варашыльскі ў Гродне. Шмат у яго з’явілася вершаў пра родную Беласточчыну. Урывак аднаго з іх — „Родны Беластоцкі край” быў апублікаваны ў № 7 за 1962 год на старонцы „Баявой Ўскалосі”:

Мой родны Беластоцкі край,
Мур цемры і бяспраўя.
Хоць лоб вось разбівай.
А голад, як абух над чалавекам.
Мізэрныя хаты...
І ўспомніш:
Няма старонкі безнадзейней
На 20 тысяч сялян
Адзін у статыстыцы — ёсьць лекар!..

Верш, відаць, пісаўся па-польску, а гэта, найхутчэй што, пераклад самога Сяргея Хмары.

З 1981 года ўжо не выходзіць часопіс „Баявая Ўскалось”. Тым не менш, на яго старонках захавалася спадчына літаратараў Беласточчыны. Нагадаю яшчэ, што вельмі часта тут друкаваў Сяргей Хмара вершы і празаічныя творы Віктара Шведа, Уладзіміра Гайдука, Сакрата Яновіча, Пятруся Макаля, Алеся Барскага і іншых аўтараў.

Сяргей Чыгрын

Вяртанне слаўнага імя

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны выпусціла юбілейны каляндарык, прысвечаны выдатнаму дзеячу навукі і культуры Вацлаву Ластоўскаму, якому сёлета, 20 кастрычніка, споўніцца 120 гадоў ад дня ягоных народзінаў. Вацлаў Ластоўскі — вядомы гісторык, публіцыст, пісьменнік, літаратуразнаўца і грамадска-палітычны дзеяч. Згадаем толькі ягоную „Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі”, якая да сённяшняга дня не страціла сваёй навуковай вартасці. Выява Вацлава Ластоўскага змешчана на фоне базыльянскага манастыра ў Беразвеччы. Пазначаны гады жыцця. Дызайн выканаў мастак Ігар Марачкін.

Ірына Ляксеева

У сэрцы Беларусі

Верхні горад

Найбольш цікавае месца (паводле гістарычных каштоўнасцей) у Мінску — гэта Верхні горад.

У 1499 г. Мінск атрымаў магдэбургскае права і так як усе гарады, пабудаваў ратушу. Таксама як усюды павінна была быць падобная планіроўка — з цэнтральнай плошчай — рынкам. У Мінску таксама ён існаваў. Сёння гэта Плошча Свабоды. Тут ёсць і сквер, у якім калісьці мастакі прадавалі свае працы, сёння гэты „вернісаж” перанесены пад Палац прафсаюзаў. Вядуцца працы па рэканструкцыі ратушы, якая ў XIX ст. была разабрана. У будучыні гэта будзе месца розных выстаў. Вежа мае быць упрыгожана гарадской сімволікай і гадзіннікам.

Непадалёк ад сквера стаяць будынкі Гасціннага двара. Яны таксама цяпер рэстаўруюцца. Пабудаваны ён быў у XVIII ст., але вельмі часта перабудоўваўся. Частка яго гэта рэканструкцыя. Тут знаходзіцца, між іншым, „Клуб Адмірал”.

На другім баку вуліцы ўзвышаецца Мінскі кафедральны касцёл св. Панны Марыі, пабудаваны ў пачатку XVIII ст. У пяцідзесятыя гады мінулага стагоддзя быў ён перабудаваны на спартыўны зал. У 90-х гадах вернуты першапачатковы выгляд касцёла. Унутры не ўбачым барочных алтароў, але захаваліся фрагменты роспісаў, асабліва над алтарнай часткай. Год ці два назад паявіліся тут новыя лаўкі стылізаваныя на барока. Сённяшні выгляд (унутраны) касцёла, гэта яшчэ не завершаны этап рэстаўрацыі. Маюць быць адкрытыя роспісы, зрэканструяваныя алтары і зробленыя канфесіяналы. Але нягледзячы на гэта, у касцёле адбываюцца імшы (галоўны этап рэканструкцыі завершаны). Ёсць і па-беларуску, і па-польску, і па-латыні.

Музычны завулак

Касцёл, разам з прылеглымі да яго будынкамі пабудавалі езуіты. Акрамя касцёла захавалася яшчэ адна пабудова, у якой сёння размешчаны музычны каледж. Але ўсё ж такі ў шасцідзесятыя гады гэты дом перабудавалі да такой ступені, што затраціў ён цалкам свой гістарычны выгляд.

Ізноў вяртаемся на другі бок вуліцы. Тут, за скверам, знаходзяцца комплексы манастыроў базыльянаў і базыльянак. Першы часта перабудоўваўся. Сёння мае ён адметнасці класіцыстычнага стылю. Другі захаваў свой першапачатковы выгляд (дзякуючы рэстаўрацыі яго вярнулі). Адсюль недалёка да манастыроў бернардзінцаў (сёння тут архіў у касцёле) і бернардзінак (Мінскі кафедральны сабор — галоўная праваслаўная святыня сталіцы). Ідучы можна заўважыць два пустыя месцы. На адным калісьці існаваў Святадухаўскі сабор — да сённяшніх дзён не захаваўся, але ў праекце ёсць адбудова гэтай царквы. Іншае пустое месца мае контуры старога будынка, які тут стаяў яшчэ да паловы дзевяностых гадоў. Яго разабралі, але на макеце рэканструкцыі Верхняга горада ён ёсць. Гэта сведчыць, што будуць яго адбудоўваць занава. Канешне, такі спосаб вяртання гісторыі дрэнны, але ўся справа ў грашах. Танней збудаваць новы, чымсьці рэстаўраваць будынак у дрэнным стане. Дарэчы, падобная справа з тарговымі радамі (каля касцёла бернардзінцаў. Старыя, адкапаныя фундаменты былі знішчаны. Адбудова вядзецца ўжо на новых.

Ёсць у Верхнім горадзе адно вельмі цікавае месца — дварок каля Чэшскага пасольства пры Музычным завулку. Аб існаванні яго даведаўся я адносна нядаўна. Калі сюды заходзіш, пераносішся ў іншы свет — зацішна, прыемна. Пасярэдзіне маленькі фантанчык. Раней думаў я, што гэта тэрыторыя пасольства, але на шчасце памыліўся.

На Музычным завулку знаходзіцца Дом масонаў. Тут размешчаны музей. Непадалёк двор Ваньковічаў (таксама музей).

Верхні горад — гэта месца, якое мінчукі трошкі недаацэньваюць. Тут заўсёды ціха, людзей мала. Хочацца верыць, што будуць адбудаваны ўсе помнікі гэтай гістарычнай часткі, ліквідаваны паркінг (за домам, у якім жыў калісьці С. Манюшка), а Верхні горад станецца турыстычнай візіткай сталіцы.

Аляксей Дзядак

Зорка

старонка для дзяцей

Міра Лукша

За сонцам

Мы чакалі доўга сонца,
Хоць, здавалася, бясконца
Ні то восень, ні зіма,
Вясны, лета ўсё няма.

І вясна так праляцела,
Лета яшчэ не паспела
Разгасціцца на зямлі,
А мы ў школу не пайшлі.

Кніжкі на паліцы склалі,
„Бывай!" школе заспявалі
І пагналіся за сонцам
Па усёй сваёй старонцы.

Загарэюць, як грыбочкі
Нашы спінкі, нашы шчочкі.
Школа ціхая, чакай.
Нас у шыбах адбівай.
Успамінай.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Развітанне з шостымі класамі ў ПШ н-р 4 у Беластоку

Узнагароды і віншаванні

Ад шасці гадоў навучэнцы беларускай мовы ў ПШ н-р 4 у Беластоку вылучаюцца дасягненнямі ў навуцы і конкурсах. Не магло быць інакш і гэтым разам. У час урачыстага заканчэння навучальнага года — 20 чэрвеня — амаль усе нашы навучэнцы атрымалі дыпломы і пасведчанні з чырвонымі палоскамі. У шостым класе такія пасведчанні атрымалі: **Наталля Швед, Міхась Каліна, Эмілія Севасытянік, Караль Заборскі, Мая Більмін, Магда Карчэўская, Альжэбета Юшчук.**

Кароль Заборскі — лаўрэат матэматычнага конкурсу „Кангур", **Эмілька Севастыянік** — лаўрэатка прадметнага конкурсу па англійскай мове, **Міхал Каліна** і **Наталля Швед** — лаўрэаты арфаграфічнага конкурсу па польскай мове, **Міхась Каліна** — лаўрэат прадметнага конкурсу па беларускай мове, **Наталля Швед**, **Магда Карчэўская**, **Мая Більмін** — лаўрэаткі дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова". Лаўрэаты беларускіх конкурсаў атрымалі дыпломы на польскай мове ад дырэкцыі і на беларускай ад БГКТ (таксама за III месца ў тэатральным конкурсе).

Пяцікласніцы — **Аня Яканюк**, **Оля Максімюк**, **Магда Саковіч** — атрымалі пасведчанні з чырвонымі палоскамі. Дзяўчаты былі ўзнагароджаны дыпломамі за ўдзел у беларускіх конкурсах.

Школьны год выдатна закончылі чацвёртакласнікі. Клас, у якім вядзецца навучанне беларускай мовы — IV „а", дасягнуў найвышэйшы ўзровень у школе — сярэдняя ацэнка 4,4.

Тут таксама вылучыліся нашы сябры: **Марыюш Урублеўскі**, **Наталля Кандрацюк-Свярубская**, **Оля Каліна**, **Аляксандр Ваўранюк**, **Мацей Карчэўскі**.

У класе процьма лаўрэатаў: **Алесь Мазурук** — лаўрэат матэматычнага конкурсу „Кангур", вылучэнне у гэтым конкурсе атрымаў таксама **Марыюш Урублеўскі**.

Наталля Кандрацюк-Свярубская — лаўрэатка арфаграфічнага конкурсу па польскай мове і гранпры Дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова", **Эмілька Мусько** — лаўрэатка пластычнага конкурсу.

Чацвёртакласнікі атрымалі дыпломы за поспехі ў „Родным слове" (ад дырэктара школы і БГКТ) і ў тэатральным конкурсе, у якім сёлета заваявалі першае месца.

Нягледзячы на факт, што навучэнцы беларускай мовы гэта ў школе да 10% усіх школьнікаў, яны становілі 40% усіх узнагароджаных.

Ганаровыя граматы атрымалі таксама бацькі. Мецэнас **Пятро Юшчук** атрымаў дыплом „Бацькі года".

На развітанне са школай шасцікласнікі прадставілі мастацкую праграму, у якой падзякавалі сваім настаўнікам. Дзякавалі ўсім на розных мовах: па-польску, па-нямецку, па-англійску. Чамусьці там не хапіла месца настаўніцы беларускай мовы. Тым больш, што дзякуючы ёй многія дзеці атрымалі так многа дыпломаў і віншаванняў.

ЗОРКА

Польска-беларуская крыжаванка № 26

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 22: Бярозка, ружа, акорд, план, акр, палатка, ранг, бор. Яр, пялун, русалка, нож, карта, закон, калідор, ар.

Узнагароды — **каляровыя алоўкі** — выйгралі: **Кася Трахімчук** з Гарадка, **Лукаш Пракапюк** з Новага Корніна, **Ева Сегень** з Беластока. Віншуем!



Конікі

У цёці Элі цікава, асабліва летам. Толькі не думай, што будуць табою займацца, госцем такім, што на канікулы „пад ігрушу" да сваякоў вясковых зваліўся. Тут табе не „ўчасы", як кажа бабця Маня, мама цёці Элі і Касінай мамы Настусі. Тут летам кожная хвіліна дарагая. Праўда, не так, як калісь. Цяпер, вось, жніво зробіць камбайн, а бабця Маня памятае час, што і серпікам даводзілася паджынаць і жаць, і за касою ісці, збіраць збожжа ў снапы. Сёння мала хто і жняяркай карыстаецца, і снапавязалкай, якая снапы сама звязвае моцным шнурком — толькі снапы стаў у дзесяткі-„ляшкі". А за камбайнам — і снапоў няма, толькі пакеты саломы. Затое не трэба пасля малаціць, складваць салому ў аграмадных снапах, напрыклад, на дошках у аборы над каровамі ці ў клуні...

На ровары ў Белавежскую пушчу

Дзень дзіцяці ў Арэшкаве святкавалі разам са Святам спорту. На ўрачыстасць вучні запрасілі бацькоў. Свята праходзіла ў будынку школы, на панадворку і далёка па-за яго межамі.

Настаўнікі падрыхтавалі ўсе неабходныя прылады дзеля спартыўных канкурэнцый. Школьнікі гулялі на спартыўнай пляцоўцы. Пачалі зранку — ужо ў 8[30]. Дырэктар прыдбала ўзнагароды і пачастунак дзецям.

Інакш, як усе іншыя класы, Дзень дзіцяці правялі вучні II і III класаў са сваёй апякункай Лідзіяй Панькоўскай і Аннай Галёнка — мамай другакласніка Арка. Наладзілі яны веласіпедную экскурсію ў Белавежскую пушчу.

Дзеці сабраліся ля школы на сваіх роварах-„гуралях". У кожнага быў рукзачок за спіной. Напачатак настаўніца прыгадала правілы дарожнага руху.

За вёскай Альшына ўсе спыніліся на кароткі адпачынак. У час падарожжа дзеці любавалія прыродай, якая красавалася з майскім імпэтам. Ля Лазіц назіралі за табуном коней, якія пасвіліся разам з жарабяткамі. Далей экскурсія спынілася ля мемарыяльнага помніка ў гонар расстраляных у час другой сусветнай вайны. Помнік стаіць пад магутным дубам.

Праз некалькі хвілін дзеці прыбылі ў пушчу і спыніліся у заездзе пад дубамі. Там агледзелі яны старыя дубы і іншыя дрэвы.

Вяртаючыся домоў нашы сябры наведалі агратурыстычную гаспадарку спадарства Патэюкаў у Лазіцах. Аглянулі хатнюю жывёлу, схадзілі над сажалку. Гаспадары паказаліся вельмі ветлівымі людзьмі.

Экскурсія запамяталася ўсім удзельнікам. Дзеці былі пад уражаннем ад жывога ўрока на ўлонні прыроды.

А ў школе яшчэ іх чакалі сувеніры — абед, шакалад і марожанае.

Міхал Мінцэвіч

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

На шляху з Арэшкава ў Альхоўку

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

На сцэне Дубічы-Царкоўныя

Рэаліты-шоу у Дубічах-Царкоўных

Агляд тэатральнай творчасці ў Гайнаўцы вылучаўся творчым рэпертуарам.

— Нашы спектаклі вырастаюць з назірання жыцця, — кажа Галіна Трашчотка, настаўніца беларускай мовы ў Гімназіі ў Дубічах-Царкоўных. Дубіцкія гімназісты паказалі два спектаклі: „Пра бацькоў і сучаснасць" і „Вяселле". Першы спектакль быў у стылі кабарэ. Сцэнарый — гэта вынік творчых пошукаў калетыву.

Сюжэт — сучасны. На лавачцы сустракаюцца суседкі. Кабеты, узалежненыя ад телесерыялаў, мараць пра сусветнае жыццё. Сваіх суседзяў, мужаў, знаёмых параўноўваюць да „гэтых-тых" з фільмаў. У канцы рашаюць закупіць тэлекамеры і наладзіць рэаліты-шоу. Тэлекамеры пачэпляць ля магазіна і малачарні, — у найбольш жывых месцах у вёсцы.

У спектаклі намечаны матыў кахання. Мясцовая паненка прыводзіць у хату Паўла, пагранічніка з новапабудаванага пагранічнага перахода. Кавалер не любіць заглядаць у чарку і таму мясцовыя дзядзькі празываюць яго „маслюком". Як вядома, гэта намёк да падзей апошніх гадоў у вёсцы, калі у Дубічах адкрылі пангранзаставу.

Цікавае назіранне мовы — усе героі спектакля размаўляюць на мясцовым дыялекце, адзін пагранічнік і малое дзіця карыстаюцца польскай мовай. Гэтае спалучэнне на сцэне выклікае смешны эфект. Як і дыялогі дзяўчат, апантаных тэмай хлопцаў.

— Не ўсе гімназісты ўмеюць размаўляць дыялектам, — кажа настаўніца. — Аднак дзеля спектакля яны хутка развучылі мову. Дапамагалі ім сябры.

— Найбольш ідэй і дыялогаў прыдумалі Бася Трафімюк і Пётр Аксянцюк, — дадае Галіна Трашчотка.

Спектакль спадабаўся камісіі — гімназісты заваявалі другое месца.

Раней яны выступілі перад сваімі бацькамі на Свята маці. Публіка заходзілася ад смеху, а акцёры — атрымалі бурныя апладысменты.

Зорка

А ў цёці Элі кароў мала, затое коней — ледзь злічыш. Асабліва калі выбегуць на падворак і дурэюць. Самавітыя, здаровыя коні сакольскае пароды. Амаль усе кабылы, бо цёця Эля гадуе самак. І жаробчыкі ды кабылкі. Не злічыш — бягуць, закідваючы задамі, гігікаюць, пырхаюць, цалуюцца, цешацца... Злічыш, калі цёця Эля пачне іх называць па імені: Каштанка, Кукалка, Каруся, Куба, Крыпі, Краля, Кузя, Крамёнка, Куля, Кама, Куна, Кінгі, Карта, Кока-Кола, Краска, Крэда, Курса, Кося... Усе кабылкі пародзістыя, і, як бачыце, імя ў іх на адну літару. А калі народзіцца жарабятка, атрымае клічку таксама на „К". Запіша цёця Эля жарабятка ў спецыяльную кнігу, выдасць пашпарт, дзе напісана, хто ягоныя бацькі, адкуль яно родам... І калі пойдзе ў свет, будзе вядома, што конік ці кабылка ўзяўся з гадоўлі пані Альжбеты Зелянкевіч.

Значыць, памагаць трэба. „Хто не працуе, той не есць", — цытуе бабця Маня філосафаў, якія запісалі гэту народную мудрасць. І Кася стараецца, дзе можа — праполвае ды палівае агарод, укопвае маладой бульбачкі на абед, рве у бульбоўніку зелле для свіней... Памагае бабулі варыць есці... А найбольш цікава пры конях. Ды не да кожнага падыдзеш — брыкаюцца. Толькі Кінгі ласкавая, сама падыдзе, пацалуе храпай у тваю выпалавелую ад сонца макаўку. Дае пачухацца, пачасацца. Ды гэта не поні ці іншы, звычайны, конь! Здаецца часам Касі, што ён — як слон! Высокі, шырокі! А найшырэйшая — Крамёнка. Носіць у жываце жарабятка. Крамёнка жаробная, кажа цёця.

— Вось, будзе табе ўзнагарода за падмогу, — сказала аднойчы ранкам стомленая ды вясёлая цёця Эля. — Сёння Крамёнка ажарабілася.

— А каго нарадзіла?

— Катарынку!

Кася засмяялася: вось, і цёзка!

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ася

Іаанна Леанеўская з Нараўкі адважна выйшла на сцэну. Дзяўчынка выступала ў пачатку конкурсу „Роднае слова", калі ў зале Дома культуры было многа дзяцей і моладзі. Ася падрыхтавала верш Ніны Тарас пад загалоўкам „Дуб і грыб".

Калі другакласніца дэкламавала свой твор, многія ўспаміналі дарогу ў Нараўку. Мястэчка распаложанае ля Белавежскай пушчы. А пушча, вядома, гэта дубы, грыбы, ваўкі, зубры...

Лясная тэматыка, як паказаў конкурс, захапляе дзяцей. Многія, пэўна, наведаюць пушчу ў час канікул.

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Нашым гідам быў настаўнік Віктар Несцяровіч (у цэнтры)

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Руіны палаца Тышкевічаў у парку

Лагойск над Гайнай

Ля Свята-Мікалаеўскай царквы ў Лагойску б'е крыніца жывой вады.

— Тут пачынаецца гісторыя горада, — кажа Віктар Несцяровіч, былы настаўнік беларускай мовы і наш гід у адной асобе.

Гораду больш за дзевяцьсот гадоў. Упершыню ўпамінаецца ў „Павучэнні" Уладзіміра Манамаха пад 1078 годам. Блізка крыніцы знаходзіцца стары парк са слядамі старажытнага замка. Сярод дрэў сустрэнем руіны палаца Тышкевічаў.

— Godna to pamięci i uwagi miłośników kraju miejscowość, gdyż jest ona jedną z najciekawszych w guberni i kraju, — адзначае ў пачатку XX стагоддзя наш любімы краязнаўца, Напалеон Роўба.

Лагойск уразіў нас беларускім духам і літаратурнымі традыцыямі.

* * *

У Доме культуры знаёмімся з Нінай Пятроўскай, загадчыцай Аддзела культуры райвыканкама.

— З Лагойшчыны выйшла многа пісьменнікаў, — пані Ніна пералічвае славутых землякоў. Літаратурная глеба тут проста небывалая.

— У Крапілаўцы жыў Антон Лявіцкі (Ядвігін Ш.), у Казіміраўцы — Уладзімір Самойла, у Кур'янаве нарадзіўся Леапольд Родзевіч, Змітрок Бядуля родам з Пасадца, Іван Пташнікаў з Задроздзева, Ніл Гілевіч і Мікола Гіль з вёскі Слабада, з Лагойшчыны Галіна Каржанеўская-Янушкевіч, Сяргей Давідовіч, Міхась Зарэмба...

Зараз у Лагойску думаюць будаваць палац.

— Будынак будзе прызначаны для патрэб літаратурнага і краязнаўчага музея, — адзначае наша субяседніца. Праўда, у раёне працуюць дзесяць музеяў, арганізаваных пры школах.

Палац стане ў старым парку, дзе ў пачатку XIX стагоддзя знаходзіўся славуты Музей старажытнасці.

* * *

Горад распаложаны ў лукавіне ракі Гайна, з усіх бакоў яго акружаюць лясы.

Разм з Нінай Пятроўскай і Віктарам Несцяровічам наведваем парк пейзажнага тыпу. Створаны ён у першай палове XIX ст., на правым беразе ракі, на 10 гектарах. Парк складаецца з двух ландшафтных участкаў — на паўднёвым збераглися рэшткі замкавых умацаванняў, валоў і равоў, на паўночным — пакатым схіле ракі ў 1815 г. быў пабудаваны ў стылі класіцызму двухпавярховы мураваны палац, ля якога збярогся пладовы сад. Ад палаца адкрываліся тры перспектывы з кулісамі, утворанымі паркавымі насаджэннямі і згуртаванымі па прынцыпе светлавога кантрасту. У парку пераважаюць дрэвы мясцовай пароды: ліпа, клён, дуб, елка. Трапляюцца белая таполя і пенсільванскі ясень.

Сярод дрэў фатаграфуем зруйнаваны ў час першай сусветнай вайны палац Тышкевічаў.

* * *

У час вандроўкі па парку ўспамінаем Музей старажытнасці. Заснавалі яго браты Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы пасля 1836 года. У ім знаходзіліся архіў старажытных рукапісаў, калекцыя мастацкіх твораў, багатая бібліятэка.

Графы Тышкевічы, прасякнутыя духам месца, былі пачынальнікамі беларускай навуковай археалогіі.

Старэйшы — Канстанцін (1806-1868), даследаваў каля 200 курганаў, гарадзішчаў, замчышчаў у Мінскай губерні. Склаў першы тапаграфічны план гарадзішчаў. У 1856 годзе ён арганізаваў экспедыцыю па Віленшчыне. Тут сабраў багаты этнаграфічны, фальклорны і археалагічны матэрыялы.

Яўстафій (1814-1873) цікавіўся гісторыяй, археалогіяй, этнаграфіяй і краязнаўствам. Быў ганаровым членам Пецярбургскай і Стакгольмскай акадэмій навук, Лонданскага археалагічнага інстытута.

У 1843 годзе з мэтай археалагічных даследаванняў наведаў Данію і Швецыю. У 1847 г. у Мінску ён член часовай камісіі па зборы і выданні старажытных актаў, грамат і прывілеяў XVI-XVII ст.ст. гарадоў Мінскай губерні. Пісаў таксама стылізаваныя на беларускі фальклор вершы. Ён аўтар аповесці „Наш край".

Музей старажытнасці ў 1855 г. быў перададзены ў Вільню.

* * *

У Лагойску няма вуліцы братоў Тышкевічаў.

— Няма таксама вуліцы Леніна, — каменціруе Віктар Несцяровіч, але ёсць помнікі Леніну, Марксу, Дзяржынскаму. Апошні вартуе побач будынка міліцыі.

У Лагойску мы не адчувалі сябе як за мяжой! Нашы субяседнікі размаўлялі чыстай беларушчынай. Выявілася, што Віктар Несцяровіч — чытач „Нівы".

Каля каплічкі святога Мікалая знаёмімся з Алесем Тарасевічам. Па ваду прыязджаюць нават людзі з Мінска.

— Дапамагае на нервы і мацуе псіхічна, — кажа Алесь, які аднаўляў капліцу.

Ганна КАНДРАЦЮК

Беларусы ўстроілі ў Польшчы „Ірак-2"

Беларускія перформеры прынялі ўдзел у фестывалі рэвалюцыйнай паэзіі, які польскія анархісты арганізавалі ў днях 29 мая — 3 чэрвеня ў Познані і Слупску.

Як паведаміў адзін з удзельнікаў творчай акцыі, мастак, паэт і перформер Зміцер Вішнёў, „Спецбрыгада афрыканскіх братоў", у якую ўваходзяць ён і Уладзімір Банько, паказала новы перформанс „Ірак-2". У час прадстаўлення маладыя людзі беспаспяхова аблівалі шампанскім дзяўчыну, якая адмаўлялася ад напою. „Гэтая алегорыя сімвалізуе тую частку маладога пакалення краіны, якая можа, але не жадае займець свабоду. Да ролі дзяўчыны мы запрасілі мясцовую прыгажуню, мастачку Ксенню Буко, якая нядаўна пераехала з Лагойска ў Слупск і пастаянна наведвае Беларусь", — сказаў Зміцер Вішнёў.

„Тэатр псіхічнай неўраўнаважнасці" пад кіраўніцтвам вядомага беларускага перформера Ілы Сіна паказаў у Познані два спектаклі — вулічнае прадстаўленне „Дэфектыўны помнік самому сабе", а таксама чарговы перформанс з серыі „Сапсаваныя цацкі". Прычым у ходзе першага прадстаўлення гледачам прапанавалася за невялікую аплату набыць часнок і жывёльныя вантробы дзеля таго, каб кідаць імі ў выканаўцу галоўнай ролі. „Нягледзячы на тое, што трэба было пераадолець акрэслены этычны бар'ер, двое дарослых і пяцёра дзяцей усё-такі адважыліся на такое амаральнае дзеянне", — заўважыў Зміцер Вішнёў.

Марат ГАРАВЫ, БелАПАН
www.naviny.by

Найбольшая вартасць — гэта людзі

У мінулым месяцы ў Гайнаўскім беларускім музеі адбылася выстаўка прац знакамітага беларускага мастака Васіля Шаранговіча. Арганізатарам выстаўкі былі Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку, Музей сучаснага мастацтва ў Мінску, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Працы прадстаўленыя на выстаўцы, гэта, перад усім, ілюстрацыі да твораў двух Міцкевічаў, двух песняроў, якіх нарадзіла беларуская зямля: „Пана Тадэвуша" Адама Міцкевіча і „Новай зямлі" Якуба Коласа (Кастуся Міцкевіча).

Цікавым было параўнанне эпохі польскай шляхты і эпапеі беларускага сялянства.

Апрача ілюстрацый да паэм на выстаўцы былі прадстаўлены аўталітаграфіі прысвечаныя тэме спаленых вёсак, акварэлі прыгожых беларускіх краявідаў.

Выстаўку наведала больш за дзве тысячы асоб.

Сёння ў музеі можна глядзець цэлы шэраг розных выставак: „Заклік пушчы" — мастацтва Віктара Кабаца і разьба Уладзіміра Мусько; фотавыстаўка „Свет дзяцінства вачамі дарослых" і этнаграфічная выстаўка „Ткацтва", падрыхтаваныя Наталляй Герасімюк; фотавыстаўка „Святая Гара Афон", падрыхтаваная Збігневам Дзванкоўскім і выдавецтвам „Братчык".

Цешыць тое, што маладыя і здольныя людзі прабуюць сваіх сіл на ніве культуры, музейнай справы. Хочацца адзначыць ініцыятыўных людзей, якія дапамагаюць ажывіць музей: Нэля Шчука, Ева Мароз-Кэчынска, Анэта Красько, Артур Заброцкі, Аляксей Харкевіч і іншыя.

Віктар БУРА

Прыгода з кніжкай

Публічная бібліятэка ў Дубінах каля Гайнаўкі існуе 39 гадоў. Ёсць тут запатрабаванне на кнігі. Цяпер 200 чытачоў карыстаецца 13-тысячным кнігазборам. Найбольш тут мастацкай літаратуры для дарослых і дзяцей — ажно 9 700 тамоў.

— Цяпер у бібліятэку купляю пераважна папулярна-навуковыя і навуковыя кніжкі, перш-наперш для дарослых, якія павышаюць свае веды ў навучальных установах або на курсах, — паясняе бібліятэкарка Раіса Кот. — У 2002 годзе купілі мы 80 кніг. Дарослыя ахвотна чытаюць сенсацыйныя, гістарычныя, прыгодніцкія і псіхалагічныя кніжкі, а таксама раманы.

У дубінскай бібліятэцы можна пачытаць газеты і часопісы (да выбару дзевяць найменняў), у тым ліку штомесячнік „Падляшскія весці".

Р. Кот арганізоўвае чытальніцкія, дэкламатарскія і пластычныя конкурсы, літаратурныя віктарыны. У ГПБ апошнім часам адкрылі выстаўку алейных карцін Паўла Верамюка, ураджэнца Дубін, які штудзіруе ў Акадэміі мастацтваў у Кракаве.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Свята-Троіцкія святкаванні

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Штогод на трэці дзень Свята-Троіцкіх святкаванняў у Крыначцы збіраецца многа вернікаў

У Гайнаўскім дэканаце Свята-Троіцкія святкаванні штогод праходзяць вельмі ўрачыста. У гэтым годзе на першы дзень свята вернікі з Гайнаўкі і навакольных прыходаў сабраліся ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы. Святую Літургію ў саслужэнні многіх святароў узначаліў епіскап Гайнаўскі Міран. На другі і трэці дзень вернікі з Гайнаўшчыны і Бельшчыны сабраліся ў Крыначцы. Далучыліся да іх паломнікі з іншых рэгіёнаў Беласточчыны.

Перад усяночным багаслужэннем пад трэці дзень свята ў Крыначку прыбыло пешаходнае паломніцтва са Свята-Троіцкага сабора. Ішлі ў ім гайнавяне, якія ўжо ад многіх гадоў пяшком дабіраюцца на святое месца. У арганізаваным шэсці вернікі неслі іконы, спявалі царкоўныя песні і маліліся. Аднак, найбольш людзей прыбыло на машынах. Для іх былі арганізаваны стаянкі, а рухам машын кіравалі лясныя працаўнікі. Яшчэ некалькі гадоў таму цяжка было размінуцца на вузкай лясной дарозе. Зараз у некаторых месцах яе пашырылі і арганізавалі дадатковы аб'езд, на які кіравалі машыны, калі іх паток буйнеў.

У Крыначцы натоўп вернікаў сярод старых велізарных дрэў не парушаў атмасферы спакою. Ужо традыцыяй стала, што ў гэтае намоленае месца людзі прыбываюць цэлымі сем'ямі. Яшчэ перад багаслужэннем па царкоўным цвінтары бегалі дзеткі, а на лавачках сядзелі старыя бабулькі. Многія вернікі спачатку ішлі да святой крыніцы, каб набраць там раней асвечаную ваду. Прамывалі хворыя месцы і выціралі загадзя падрыхтаванымі хустачкамі, якія пасля пакідалі на плоце і кустах. Ваду бралі ў бутэлькі, каб завезці дамоў. У некаторых сем'ях вада з Крыначкі стаіць цэлы год і п'юць яе хворыя. Тыя вернікі, якія аздаравелі дзякуючы малітвам і свянцонай пушчанскай вадзе, ахвотна наведваюць Крыначку. Аднак толькі некаторыя рашаюцца публічна расказаць пра аздараўляльную моц вады. Жыхар Варшавы, дзякуючы абмыванню твару вадой з Крыначкі вылячыўся ад пухліны скуры. Найбольш асоб аздаравела пасля малітваў у Крыначцы з ліку мясцовага насельніцтва. Старэйшыя расказвалі сваім дзецям і ўнукам пра лячэбную моц святога месца ў Белавежскай пушчы і колькасць яго наведвальнікаў хутка павялічвалася. Існуе павер'е, што ў мінулым людзі здаравелі пасля абмыцця вадой з Крыначкі. Аднак нейкая пані прывязла ў Крыначку сабаку і выкупала яго ў святой вадзе. Пасля гэтага здарэння карыснае ўздзеянне вады рэзка паслабела. З гэтым павер'ем некаторыя нязгодны. Лічаць яны, што зараз вера ў Божую дапамогу намнога слабейшая чым была ў мінулым. Людзі жывуць больш грахоўна, мала ўвагі адводзяць Гасподнім запаведзям і не посцяць. Грахоўнае жыццё — прычына меншага гаючага ўздзеяння вады. У час пропаведзі архімандрыт Паісій паясніў значэнне Свята-Троіцкіх святкаванняў і звярнуўся да вернікаў з заклікам больш актыўна ўдзельнічаць у царкоўных багаслужэннях.

Вернікі раз'язджаліся дамоў з надзеяй, што пасля малітваў атрымаюць Божую ласку ў аблягчэнні хваробаў і жыццёвых патрэбах.

Аляксей Мароз

Адмысловая святыня

Побач дарогі з Новага Вострава ў Паўночны Востраў, перад абшырнай плантацыяй парэчак, задзівіла мяне каплічка з выявай Чанстахоўскай Божай Маці, выкананая з калодкі. Недалёка яе парэчкавы садок парадкавалі работнікі і іх я спытаў пра аб'ект майго задзіўлення.

— А яна не новасць! — здзівіліся маёй несвядомасці яны. — Такіх каплічак ужо пастаўлена васемнаццаць; паставіў іх майстар з Белавусаў — Вільчэўскі.

— І пасвенчана яна?

— Абавязкова! Быў дзеля гэтага бюджэт і ўсё зроблена па-Божаму.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Крыж — сведка чалавечага лёсу

Кожны прыдарожны крыж мае сваю гісторыю, якую піша самое жыццё. Едучы з Браньска ў Бельск маю ўвагу прыцягнуў крыж насупраць крамы ў вёсцы Кальніца. Вяскоўцы ахвотна выказаліся і пра грамадска-гаспадарчую трансфармацыю.

Прыдарожны крыж з часанага каменя ў Кальніцы выканаў калісь мясцовы майстар Пажэжыньскі. Каля крыжа адбываецца абрад асвячэння палёў; ён таксама вывадны — адпраўляюцца тут паломнікі і памерлыя. Як расказаў мне Эўгеніюш Прушатар, пенсіянер, уладальнік суседняга з крыжам палетка, крыж гэты нагадвае таксама пра трагедыю з часу апошняй вайны. Загінула тут некалькіх савецкіх салдат, а нямецкая гармата не абмінула і крыжа, які быў збіты з асновы; пасля вайны крыж паставілі крыху збоку. Пабітых салдат пахавалі былі каля крыжа, але пасля вайны эксгумавалі іх.

— Я яшчэ быў дзіцём, — успамінае, — калі іх раскопвалі. У шкураных ботах былі толькі галёначныя косці, дык іх выцягалі і палакалі. Астанкі перапахавалі ў Варшаву. А пасля, мо праз дзесяць гадоў, прыехала сюды маці аднаго з загінуўшых, усклала на гэтае месца кветкі. Адкуль даведалася? Тагачасны загадчык Пачатковай школы ў Кальніцы, Паплаўскі, прачытаў у газеце, што сям'я шукае загінуўшых. Распытаў мясцовых людзей і яны навялі, што такі тут быў.

— А ці ў вёсцы яшчэ ёсць школа? — пытаю.

— Няма. Калісь тут была дворская сядзіба (перабудаваная ў 1870 годзе і адрамантаваная ў 50-х гадах 20 ст. — М. М.), а цяпер сцягнулі сюды мо з восем асоб з Казахстана. Цяпер праводзіцца рамонт будынка, ёсць на гэта грошы. Мо ўрад даў? — пытае сябе Эўгеніюш Прушатар і дзівуецца: — Карычневай бляхай дах накрылі, а калісь, як была школа, то будынак развальваўся.

— А як тут маецца сельская гаспадарка? — дапытваюся. — Ці многа гаспадароў?

— Ёсць. Але не гаварыце на гэтую тэму! Я ўжо стары, мне 68 гадоў. Сорак грошаў за літр малака. А цяпер адымі мыючую вадкасць — бо памыць трэба! І яшчэ пяць грошаў заплаці, бо ўсё цяпер пайшло ў прыватныя рукі. То і не аплачваецца. Пан, я не хачу грашыць супраць Рэчы Паспалітай, але я пры камуне жыў. Не хачу гаварыць, гэтага не вернеш, але свет мяняецца і трэба прыстасавацца. Але я пры камуне жыў, канём рабіў, сельгасгурток абрабляў зямлю. А сёння? Сёння маю трактар, прылады і недахоп грошай. Учора салат у краме браў напавер...

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Праваслаўныя могілкі і царкоўка побач шашы Бельск — Браньск

Выязджаючы з Браньскай гміны відаць у ляску пры шашы каменна-тэрацавы крыж з напісам: „W hołdzie poległym w obronie Ojczyzny i wiary..."

Першы тыпова праваслаўны прыдарожны крыж (з 1982 года) напаткаў я ў сярэдзіне вёскі Шасталы (Бельская гміна). Крыху далей ад вёскі, пры шашы Варшава — Белавежа, стаіць царква — гэта могільнікавы драўляны храм. Відаць, што гэта новы аб'ект, яшчэ не абгароджаны. Пры кроквах на паддашшы не хапае некалькіх дошак і гэта стварае прыгнятаючае ўражанне. Побач абгароджаныя старыя праваслаўныя могілкі, але большасць крыжоў — сучасныя, з тэрацца.

Кожны крыж з'яўляецца сведкам людскога лёсу, сведкам тых, якія ўжо адышлі, якія любілі свой народ, сваю рэлігію, сваю мову.

Міхал Мінцэвіч

Стацкі саветнік Ігнат Даніловіч

Сёлета спаўняецца 160 гадоў з дня смерці Ігната Даніловіча. У апошнія гады, дзякуючы даследаванням сяброў Беларускага гістарычнага таварыства ў Польшчы і перш за ўсё працам Алега Латышонка і Базыля Белаказовіча, высветлена яго роля ў стварэнні нацыянальнай гістарыяграфіі і навуковага беларусазнаўства, распрацоўцы беларускай нацыянальнай ідэі.

Значна менш мы ведаем аб жыцці і навукова-педагагічнай дзейнасці Ігната Даніловіча, асабістых дабрачыннасцях гэтай велічнай постаці нацыянальнай культуры. У пэўнай ступені ліквідаваць гэты недахоп дазваляюць крыніцы, знойдзеныя ў бібліятэках Расіі і, у прыватнасці, „Біяграфічны слоўнік прафесараў і выкладчыкаў імператарскага Маскоўскага універсітэта", які пабачыў свет у 1855 годзе.

У артыкуле, прысвечаным прафесарскай дзейнасці Ігната Даніловіча гаворыцца, што ён выйшаў у адстаўку па стане здароўя ў 1842 годзе, праслужыўшы ва універсітэтах Расіі 28 гадоў і дасягнуўшы чыну стацкага саветніка паводле табелю аб рангах. Табель аб рангах, уведзены Пятром I у 1722 годзе замест радавітасці ў службовай дзейнасці ўлічваў асабістыя заслугі, здольнасці, адукацыю, вопыт. Падзяляў усе пасады ў арміі, флоце і цывільным апараце на 14 класаў. Самым нізкім быў 14 клас, якому адпавядаў чын калежскага рэгістратара, самым высокім — першы, якому адпавядаў чын канцлера.

Чын стацкага саветніка адносіўся да пятага класа і адпавядаў пасадзе віцэ-губернатара, генерал-маёра ў арміі або контр-адмірала ў флоце і да 1856 года даваў права на патомнае дваранства.

Сярэднюю адукацыю Ігнат Даніловіч атрымаў у Ломжынскай гімназіі. У 1810 годзе паступіў на юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта. Падчас Напалеонаўскай вайны 1812 года, калі універсітэцкія курсы былі прыпынены, прыняў пасаду сакратара французскага губернатара Фер'е ў Беластоку, якую выконваў да адступлення французскай арміі.

Віленскі універсітэт закончыў у 1814 годзе з вучонымі ступенямі кандыдата і магістра і ўзнагародай, якая прызначалася выбітнейшым студэнтам. У гэтым жа годзе распачалася ягоная навукова-педагагічная дзейнасць у якасці выкладчыка мясцовага права.

У 1814-1818 гадах Ігнат Даніловіч дасканаліў свае веды і педагагічнае майстэрства ў Варшаўскім, Санкт-Пецярбургскім і Маскоўскім універсітэтах. Пасля вяртання ў Віленскі універсітэт заняў кафедру рускага грамадзянскага і крымінальнага права і польска-літоўскіх законаў. У 1819 годзе атрымаў званне ад'юнкта, а ў 1822 годзе — экстраардынарнага і затым ардынарнага прафесара.

Прафесарская дзейнасць Ігната Даніловіча доўжылася 20 гадоў у Віленскім, Харкаўскім, Кіеўскім і Маскоўскім універсітэтах. Ягоныя біёграфы падкрэсліваюць, што ён пераходзіў з аднаго універсітэта ў другі па загадзе міністра народнай адукацыі Расіі і асабістым жаданні. У Маскоўскім універсітэце Ігнат Даніловіч працаваў у 1838-1842 гадах. Чытаў законы добраўпарадкавання і благачыннасці, а таксама мясцовыя законы заходніх губерняў. Працуючы ў Харкаўскім, Кіеўскім, Маскоўскім універсітэтах чатыры разы абіраўся дэканам юрыдычнага факультэта.

У 1830 годзе ў сувязі з узніклым праектам падрыхтоўкі законаў для заходніх губерняў Расійскай імперыі, прафесар Даніловіч быў адкліканы з Харкаўскага універсітэта ў другое аддзяленне Уласнай Яго Вялікасці Канцылярыі ў якасці рэдактара, дзе некалькі гадоў працаваў над падрыхтоўкай Статута законаў, за што быў узнагароджаны Ордэнам св. Анны II ступені.

Прафесар Ігнат Даніловіч карыстаўся павагай студэнтаў і калег, да яго прыхільна ставіліся кіраўнікі універсітэтаў і чыноўнікі Міністэрства народнай адукацыі. Падставай для гэтага былі яго энцыклапедычная адукаванасць, аратарскія здольнасці, веданне асноўных еўрапейскіх моў. Ён не толькі размаўляў на лацінскай, французскай, нямецкай і рускай мовах, як на сваёй роднай, але і пісаў на гэтых мовах навуковыя працы. У прыватнасці, яго даследаванне „Гістарычны нарыс літоўскага заканадаўства" першапачаткова было напісана і выдадзена па-нямецку.

Ігнат Даніловіч пакінуў значную навуковую спадчыну. Сярод яго асноўных прац „Бібліяграфічнае апісанне літоўскага статута", „Гістарычнае даследаванне пра цыганоў", „Статут Казіміра IV як помнік Літоўскага заканадаўства XV стагоддзя", „Аб медалях і кабінетах Нясвіжскім і Харкаўскім", „Заўвагі пра іпатэку", „Гістарычны погляд на ўзнікненне старажытных славянскіх гарадоў да XIII стагоддзя" і іншыя. Ён удзельнічаў у рэдагаванні „Кнігі пасольскай Метрыкі Вялікага княства Літоўскага", якая пабачыла свет у 1843 годзе ў Маскве ў двух тамах. Навуковыя працы Ігната Даніловіча сведчаць аб яго глыбокай вучонасці і арыгінальнасці падыходаў да даследавання старажытных помнікаў славянскага заканадаўства.

Прафесар Ігнат Даніловіч памёр 30 чэрвеня 1843 года ў горадзе Грэфенбергу і там жа быў пахаваны.

Біяграфічны слоўнік прафесараў і выкладчыкаў імператарскага Маскоўскага універсітэта не толькі значна дапаўняе нашыя ўяўленні аб жыцці і навукова-педагагічнай дзейнасці прафесара Ігната Даніловіча, але і ставіць шэраг пытанняў, якія патрабуюць адмысловых даследаванняў. Адно з такіх пытанняў — гэта год нараджэння Ігната Даніловіча. У сучасных беларускіх энцыклапедычных выданнях падаюцца дзве даты нараджэння Ігната Даніловіча. Энцыклапедычны даведнік „Мысліцелі і асветнікі Беларусі" (1995) лічыць, што Ігнат Даніловіч нарадзіўся 30 ліпеня 1788 года, а „Энцыклапедыя гісторыі Беларусі" (1996) і „Беларуская энцыклапедыя" (1998) — 30 ліпеня1787 года. Біяграфічны слоўнік, аб якім вышэй ішла размова, падае часам нараджэння Ігната Даніловіча 1789 год. Артыкулы да слоўніка пісалі вучні прафесараў Маскоўскага універсітэта. Яны грунтаваліся на службовых спісках прафесараў і выкладчыкаў універсітэта, якія захоўваюцца ў яго архівах. І таму, на наш погляд, дакладны час нараджэння прафесара Ігната Даніловіча патрабуе навуковага ўдакладнення. Але гэта справа адмысловага даследавання.

Сяргей Габрусевіч

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Малебен на вяршыне касагора 12 мая г.г.

Брацкія могілкі

У канцы чэрвеня 1941 года на нашу Беласточчыну ўварвалася вайна несучы за сабою смерць і знішчэнне. Яе ўдары не міналі і мірнага насельніцтва. У савецкае войска трапілі маладыя прызыўнікі і з нашых вёсак і гэта ў першую чаргу яны спазналі пекла ад пораху і тратылу. І шмат каму з іх жыццё абарвалася непадалёк роднага дома.

Праязджаючы мост на Нарве па дарозе з Бельска ў Заблудаў бачны парослы лесам узгорак на поўнач ад ракі і на ўсход ад шашы. У час вайны не было там лесу, адно поле. Гэты касагор, з добрым відам на пераправу, стаў зручным месцам для арганізацыі абароны моста саветамі ад захопу немцамі. 25 і 26 чэрвеня 1941 года там адбылася бязлітасная бітва, у якой загінула 200-300 маладых людзей у савецкіх мундзірах — у іх ліку верагодна і жыхары навакольных вёсак: Праневіч — Васіль Герасімюк і Аляксей Васілеўскі, і Рыбал — Мікалай Міранюк, Аляксей Леановіч і Пётр Дмітрук. Загінула таксама шмат немцаў, але іх целы адразу пасля бітвы былі пахаваны на асобных могілках іхнімі таварышамі. Целы ж савецкіх салдатаў ляжалі два ці тры дні і іх — у тыя жудасныя дні — не вазілі на ніякія могілкі, але — паколькі стаяла жара — закапалі ў тых акопах, дзе іх застала смерць; хавалі іх жыхары Плёсак, Рыбал, Войшкаў, Канюкоў. Адбылося гэта 28 чэрвеня.

Сёння на згаданым узгорку, які стаў абшырнымі брацкімі могілкамі, вырас стройны ўжо лес. Толькі ў адным месцы, дзе ў канцы пяцідзесятых гадоў жыхары Рыбал перапахавалі астанкі аднаго невядомага салдата, магілка абгароджана і пастаўлены крыж. А ўсе апошнія ляжаць у невядомых месцах. І грэх сказаць, што яны там пакояцца, бо час ад часу нейкія варвары прабуюць дакапацца да мілітарыяў; яшчэ і цяпер відаць там не надта старыя ямкі.

Валянцін Герасімюк, сын загінуўшага ў тым баі Васіля Герасімюка з Праневіч, стаў хадайнічаць за ўстанаўленне мемарыяла загінуўшым там ахвярам жорсткай вайны. Пісаў ён і ў Юхнавецкую гмінную ўправу, у беластоцкія ўстановы, у беларускае і расійскае пасольствы, прэзідэнту Рэчы Паспалітай. Тры гады доўжыліся яго захады па выдзяленні месца пад ваенны мемарыял салдатам, у ліку каторых быў яго бацька.

12 мая г.г., у першую нядзелю пасля гадавіны заканчэння другой сусветнай вайны, на мемарыяльным месцы адбылося памінальнае набажэнства за душы загінуўшых навокал невіноўных людзей. Служылі а. Рыгор Сасна, настаяцель Рыбалаўскага прыхода, і а. Анатоль Войцюк, ваенны капелан з Беластока. З кароткімі выказваннямі выступілі прадстаўнікі Юхнавецкай гміны, беларускага і расійскага пасольстваў. Мерапрыемства арганізавалі пажарнікі з Войшкаў.

Сёння каля Войшкаў праз мост на Нарве бяспечна калясяць мірныя машыны. Іх пасажырам ці шафёрам наўрад ці пралятае думка, што ў ваенны час мост уступае ў небяспечныя ваенныя дзеянні і, быццам павісшы над Стыксам, перапраўляе апынуўшыхся паблізу людзей на той бок жыцця. І ў лесе, што на касагоры ў напрамку Канюкоў і Рыбал, залеглі салдаты, якіх бязлітасная вайна паклала побач моста, быццам яны на жыццё і смерць звязалі з ім свой лёс.

Аляксандр Вярбіцкі

Слупы на дарозе

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Побач чыгуначнай станцыі Кляшчэлі праходзіць гравейка. Карыстаюцца ёй жыхары Дабрывады, Рэпчычаў а нават Кузавы, паколькі для іх намнога бліжэй у горад. Сяляне ездзяць гравейкай у поле. І тут праблема. Дарога вельмі вузкая, пры чым у час мадэрнізацыі электрычнай лініі паставілі слупы побач канавы. Зараз выявілася, што слупы апынуліся на дарозе.

— Немагчыма снапавязалкай праехаць у поле, — скардзіўся знаёмы селянін. — Трэба амаль кіламетр аб'язджаць укругавую...

Ёсць і іншая праблема. Пасля здачы ў карыстанне Рэпчыцкага вадасховішча дарогаю праязджаюць дзесяткі аўтамабіляў. Цяжка размінацца шафёрам праязджаючым у процілеглых напрамках. Малая няўвага і можна ўрэзацца ў слуп.

Мне здаецца, што час вырашыць праблему. Гэта мая прапанова ў адрас мясцовага самаўрада, дарожных улад і паліцыі ў Гайнаўцы. Трэба прыняць адпаведныя меры, каб пазбегчы дарожнага выпадку.

Уладзімір Сідарук

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Днём гайнаўскі вакзал пустуе, а ноччу праязджаюць праз яго цягнікі з небяспечным грузам

Небяспечны начны транспарт

Ноччу праз Семяноўку, Гайнаўку і Чаромху возяць чыгункай небяспечныя для здароўя хімікаты. Пасля чыгуначнай аварыі цыстэрнаў з хімікатамі ў Беластоку сталі пускаць яшчэ больш цягнікоў з небяспечнай для здароўя людзей сыравінай праз Семяноўку і Гайнаўку. Таксама, штораз больш машынных цыстэрнаў з аўтагазам і аўтолам праязджае праз Гайнаўку. Наглядаць за перавозамі хімікатаў павінны працаўнікі чыгункі і пажарнікі. Для ліквідацыі паслядоўнасцей аварый патрэбныя дарагія машыны і прылады, якіх вельмі мала ў Гайнаўскім павеце. У 2002 годзе перавярнулася дарожная цыстэрна з аўтолам каля Крыўца, а раней з газам каля Гарадзіска, але хімікаты не выцяклі. Гайнаўскія радныя рашыліся пазнаёміцца з праблемай транспарту хімікатаў праз Гайнаўку і запрасілі на сесію Рады горада прадстаўніка Дзяржаўнай пажарнай аховы ў Гайнаўцы.

— Мы можам ліквідаваць аварыю, калі з цыстэрны выцякае невялікая колькасць хімікатаў. Нашыя пажарнікі не ў змозе ліквідаваць катастрофу 5-10 цыстэрнаў, — заявіў намеснік каменданта Дзяржаўнай пажарнай аховы ў Гайнаўцы капітан Ежы Пятрочук у час сесіі Рады горада. — За кантроль перавозаў небяспечнай сыравіны адказны ваяводства, але зараз цяжка акрэсліць размер гэтых перавозаў. Няма адпаведнай пастановы, якая патрабавала б інфармаваць пажарнікаў пра перавозы хімікатаў. Толькі ад чыгункі залежыць, ці паінфармуюць нас аб перавозах небяспечных прадуктаў.

— Пасля чыгуначнай аварыі ў Беластоку пабольшаў перавоз небяспечнай сыравіны праз Гайнаўку. Зараз цяжка спадзявацца, што гэты транспарт абміне наш горад. Застаецца толькі мець надзею, што не здарацца чыгуначныя або дарожныя катастрофы, — сказаў бурмістр Анатоль Ахрыцюк.

Паінфармаваў ён, што Гайнаўка не падрыхтавана да перавозу праз горад небяспечнай для людзей сыравіны. Вакол горада няма дарогі, якой маглі б ездзіць машынныя цыстэрны з хлорам або аміякам.

— Нехта можа падлажыць бомбу і разарваць цыстэрну з хімікатамі і тады можа быць пагроза для жыцця людзей на вялікай адлегласці ад катастрофы. Што тады трэба рабіць жыхарам Гайнаўкі? Ці нехта вучыў людзей, як яны павінны весці сябе ў такіх выпадках? — пытаў адзін з радных.

Капітан Ежы Пятрочук стараўся супакоіць радных. Паясняў, што Гайнаўцы не пагражаюць тэрарызм і дарожныя катастрофы. Сказаў, што цыстэрны не павінны знішчыцца нават у час чыгуначных аварый. Таму жыхары гарадоў не інфармуюцца аб паслядоўнасцях, якія выклікаюць хімікаты, што маглі б выцячы з цыстэрнаў. Зараз у Дзяржаўнай пажарнай ахове працуе сістэма асцерагання, у якую ўключаны перавозы хімікатаў. Аднак няма прыладаў, якія маглі б хутка інфармаваць аб хімічных аварыях. Гайнаўскія пажарнікі звярнуліся да гарадскіх улад за дапамогай размерам у 350 тысяч злотых на куплю прылад патрэбных для ліквідацыі хімічных катастрофаў, а атрымалі падтрымку размерам 2 тысяч злотых.

— Мы хочам адчуваць сябе бяспечнымі, — заявіла радная Ядвіга Рудзінская-Патэюк. Запрапанавала яна выдаткоўваць дадатковыя сродкі на паляпшэнне працы пажарных службаў, адказных за ліквідацыю паслядоўнасцей хімічных аварый. Бурмістр Анатоль Ахрыцюк тлумачыў, што за перавоз хімікатаў адказныя ваяводскія ўлады, а ў бюджэце цяжка знайсці большыя сродкі, патрэбныя для пажарнікаў. Некаторыя радныя прапанавалі разам з закрыццём пасажырскіх чыгуначных перавозаў патрабаваць ліквідацыі перавозаў хімікатаў праз Гайнаўку. Цяжка будзе дабіцца гэтага, бо жыхары Гайнаўшчыны хочуць захавання пасажырскага транспарту. Зараз грузы перавозіць іншае чыгуначнае прадпрыемства, незалежнае ад пасажырскіх перавозаў. Можна толькі разлічваць на экалагічны аспект залежны ад Белавежскай пушчы.

Аляксей Мароз

Нараўчанскія інвестыцыі

Сёлета многа зрабілі

У першым сёлетнім паўгоддзі ў Нараўчанскай гміне маем ужо асфальт на галоўнай 1 200-метровай вуліцы Лясной у Новай Луцэ — ад новапабудаванай невялікай тамашняй царкоўкі да шашы з Міхалова ў Нараўку праз Бандары. Раней была тут гравейка. На працягу чэрвеня шпаркімі тэмпамі клалі асфальт на павятовай дарозе з Плянты ў Лясную. Як вядома, каля вёскі Плянта знаходзіцца чыгуначны перагрузачны пункт. Раней тут быў ухабісты брук і брусчатка. У палове чэрвеня г.г. новае дарожнае палатно — лепшага сорту асфальт — праклалі да скрыжавання дарог Плянта — Лясная — Міклашэва. Будзе гэта адрэзак 4-5-кіламетровай даўжыні. На абочыны дарогі насыпалі жвіру, яго расплянтавалі і адпаведна ўфармавалі г.зв. карону дарогі.

У Новым Ляўкове зараз закончылі пабудову санітарнай каналізацыі. Цяпер жыхары гэтай вёскі маюць ваду з крана і іншую выгаду. Вядома, гэтая інвестыцыя не абышлася без іх грашовых узносаў.

У гэтым годзе пачнуць пабудову водаправодаў на хутарах Новага Ляўкова і Семяноўкі. У далейшым будуць працягваць пабудову каналізацыі і ачышчальні сцёкаў на набярэжжы Семяноўскага вадасховішча.

Янка Целушэцкі

Альхоўка з новым солтысам і радай

У пачатку гэтага года адбыліся выбары новых солтысаў і салэцкіх радаў. У вёсцы Альхоўка (Нараўчанская гміна) солтысам выбралі Юрыя Лукшу і салэцкую раду ў саставе: Тадэвуш Кшыжанскі, Тамаш Сачко, Зінаіда Лукша і Марыя Раманчук.

26 сакавіка адбылося пасяджэнне салэцкай рады Альхоўкі, на якім быў прыняты план дзейнасці ў гэтым годзе. Солтыс і рада салэцтва ўзялі пад увагу перш-наперш прыстасаванне апусцелага школьнага будынка на вясковую святліцу (трэба адрамантаваць дах). Пасля добраўпарадкавання колішняга школьнага панадворка на ім неабходна пабудаваць спортпляцоўку. Рамонту патрабуе таксама плот вакол былой школы.

У Альхоўцы пабудавалі новае дэпо для тамашняй добраахвотнай пажарнай каманды. Зараз трэба ліквідаваць стары гараж на пажарны самаход і забраць трывожную сірэну ў новае дэпо.

Рада салэцтва пажадала мець у вёсцы вялікі кантэйнер на смецце. Быў я ў Альхоўцы 13 чэрвеня г.г. і ля прадуктовай крамы бачыў тры кантэйнеры. Даведаўся таксама, што планы дзеля паляпшэння жыцця жыхарам Альхоўкі новавыбраная салэцкая рада будзе рэалізаваць у другім паўгоддзі 2003 года.

(яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фірма-вецер

Нейкія два гады назад купіў я быў новую карту новага нашага ваяводства; старыя карты здаваліся былі крыху замалымі для маіх патрэб. Але новая карта праз згаданы час не патрэбілася мне і толькі на днях рашыў я глянуць на яе. Ну і адчуў сябе быццам сам Калумб разглядаючы новае. А новыя там назвы шматлікіх мясцовасцей. Прыводжу прыклады: *Miłowice Paszki* (Мілковічы-Пашкі) у Драгічынскай, *Wólka Nadbóżna* (Вулька-над-Бугам) у Сямятыцкай, *Mikulisze* (Мікулічы) у Мілейчыцкай, *Berczyszcze* (Бэрэзышчэ) і *Opoka Duża* (Апака-Вялікая) ў Чаромхаўскай, *Dubicze Tofiłowskie* (Тафілаўцы) у Дубіцкай, *Czyżki* (Чыжыкі) у Гайнаўскай, *Łąknica* (Локніца) у Бельскай, *Gordoczyno* (Гародчына) у Нарваўскай, *Ochrechowicze* (Ахрэмавічы) у Заблудаўскай, *Ciwoninki* (Ціванюкі) у Міхалоўскай, *Kłodno* (Калодна), *Chomonotowce* (Коматаўцы), *Bobrawniki* (Баброўнікі) у Гарадоцкай і *Łoszczany* (Ласіняны) у Крынскай гмінах. Назва карты таксама асаблівая: *Województwo Podlaskie administracyjno-drogowe* — таксама вельмі цікавая. І яшчэ адзін несумненны плюс гэтай карты: ёсць там мясцовасці без назваў і назвы без мясцовасцей, напр. згаданай ужо вёскі *Ochrechowicze* зусім няма на карце, так як і Талькоўшчыны ў Шудзялаўскай гміне. Стачок, які амаль шчыльна прылягае да Нараўкі, апынуўся на скупаўскіх хутарах. А назва *Rudaki* (Крынская гміна) красуецца ў зусім пустым полі, а там, дзе павінна быць вёска, дарога з Ласінян у Коматаўцы акурат выходзіць у Беларусь і з Беларусі вяртаецца; няйначай маецца справа і з Юраўлянамі ды Азяранамі. А разлеглая вёска Паўднёвы Востраў у Крынскай гміне пільна і верна пазначана на карце, толькі назва яе адсутнічае; падобнае можна сказаць і пра Капітаншчыну ў Нараўчанскай гміне. Дапытлівага чытача можа цікавіць фірма, якая выпусціла такую разынку, тады калі ласка: *„Mapy Ścienne" Beata Piętka*. Адрас фірмы адсутнічае, затое ёсць засцярога, што ўсялякае перавыкарыстанне гэтага картаграфічнага шэдэўра патрабуе пісьмовай згоды выдавецтва. „Адрасам" для карэспандэнцыі — хаця б дзеля атрымання згаданай згоды ці іншых мэтаў — мабільныя тэлефоны...

Аляксандр Вярбіцкі

Папраўка

У артыкуле Зосі Лемеш „У дарослы свет" („Ніва" № 25 ад 22.06.2003 г.) намі была дапушчана памылка. Прадстаўніком мясцовых улад на школьнай урачыстасці ў Гайнаўскім беларускім ліцэі быў **Уладзімір Петручук, начальнік аддзела асветы Гайнаўскага павета**, а не гайнаўскі старасta. За памылку перапрашаем аўтарку, зацікаўленых асоб і чытачоў.

Рэдакцыя

Узнагароды...

... за правільны адказ на ***12-е конкурснае пытанне*** атрымоўваюць: **Марцін Александрук** з Дубіч-Асочных, **Міхась Гацута** з Трывежы і **Дам'ян Мартынюк** з Новага Беразова.

Гутаркі, што ўздымаюць дух

Сонейка, якое прыгравала ў лесе прывяло Сандара Жоржавіча ў расслабленне. Нават членам уселяснога кіраўніцтва растапіла вышэйшыя думы. Лагічныя ідэі, асабліва лані Гаўрусісе, расплываліся бы сала на распаленай патэльні ў чаканні яек. Па ўзлесках звярына швэндалася без мэты. Сандар Жоржавіч адчуваў настроі. Неспакойна пахаджваў па сваёй бярлозе, бо да таго ўсяго няўхільна набліжаўся канец ягонага панавання, вызначаны дамовай з лясною браціяй.

— Гэтыя ж ёлупні без мяне не дадуць сабе рады, — маркоціўся правадыр перад чарговым сходам уселяснога кіраўніцтва.

На паляне, у чаканні мядзведзя, дзяцел Стукач выдумаў гульню, сам назіраючы за яе ходам з дуба.

— Створым піраміду адзінства нашых разнастайнасцяў. Калі атрымаецца, дык можна будзе па яе ўзоры помнік ставіць, як сімвал пануючых у нашым лесе розных многасцяў, — прапанаваў быў Стукач.

Кіраўніцтва ахвотна згадзілася. На сярэдзіне паляны цвёрда на сваіх дзікавых нагах стаяў Свіналыч. На яго спіну з грацыяй ускокнула лань Гаўрусіха. На яе рашуча ўскараскаўся заяц Генадзь, на зайца дзыгнула вавёрка Кацюша. Усе напнуліся з гонарам. Дзяцел не мог стрымацца ад хіхікаў, дык убіў дзюбу ў дуб.

Тым часам на паляну ўкрочыў Жоржавіч. Аслупянелы ад відовішча, выгукнуў:

— Аштомнетут!

Піраміда раптам разляцелася, бы калісьці Аб'яднанне Лясных і Пушчанскіх Дзяржаў. Кіраўніцтва маланкава стала ў шэраг, толькі Стукач, як звычайна, застаўся на дубе.

— Вы тут сабе кепікі строіце, а ў лесе — недахоп каштоўнасцяў, — стаў павучаць мядзведзь. — Трэба падмацаваць дух лясного люду, падрыхтаваць, каб зразумелі ўсе яны, што нічога без мяне.

Кіраўніцтва ўсё трывала ў нерухомасці. Сандар Жоржавіч, каб расслабіць атмасферу, загадаў:

— Вольна! І каб памяталі! Загадваю сарганізаваць і абучыць чацвёркамі: птах, гад, паўзун ды млекакормячы. Час ад часу маюць хадзіць па ўзлесках і праводзіць гутаркі, якія ўзмоцнілі б пазваночнікі нашага люду.

— А што з беспазваночнымі? — нясмела азвалася лань Гаўрусіха.

— Якая ты, Гаўрусіха, некемлівая. Гэта метафара, справа ж не ў шкілеце, — спрабаваў тлумачыць мядзведзь.

— Ну, — лань прытварылася, што кеміць.

Сандар Жоржавіч і кіраўніцтва вярнуліся да сябе, рыхтаваць узорныя гутаркі. Сочачыя за сходам на ўскрайку паляны змяя Сспаія і вуж Ззянон радасна запляліся за хваёвы ствол.

— Так ці іначай, нашых ідэйных пазваночнікаў не пераб'юць, — засысыкала Ссапія.

МакХолад

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Двух гандляроў прадаюць на базары кошыкі: адзін па чатыры злоты, а другі па два. Вечарам сустрэліся.

— Як ты робіш, — пытае той, што прадаваў даражэй, — што прадаеш такія самыя як у мяне кошыкі два разы танней? Я краду лазіну для іх вырабу ды ледзь-ледзь мне гэтая дзейнасць аплачваецца...

— Бо ты разява! Я краду не лазіну, але гатовыя кошыкі.

* * *

— Якая розніца між бігамістам і ўдаўцом?

— Бігамісту стацца ўдаўцом лягчэй.

* * *

— Водпуск, гэта такі перыяд, калі заміж загадаў брыгадзіра выконваецца загады жонкі.

* * *

— Сёння наш дырэктар страшэнна злосны; гавораць, што звольніў палову персаналу.

— Гэта нас не кранае. Ён пасварыўся з жонкай і выкідае з працы яе сваякоў.

* * *

— Якая розніца між тэлевізарам і жонкай?

— Тэлевізар можна выключыць.

Адгаданка

Ласкавае сіяцельства

(анаграмная шарада)

Лес зашумеў, сеў цар уселясны на трон —
Быццам прарок будзе трымаць прамову ён —
КАБ** слухаў тлум, ён **АБ ПЛОТ** абапер **БІЧ...
***АСА** асавела, **А** дзік, бывалы **ЗУХ**, абвесіў **ЛЫЧ**,*
Вавёрцы, лані і лісіцы ўздыбілася шэрсць:
Падумаеш — як цар метка ўпячэ — будзе балець!
*— Ад болю — ікнула **АСА** — ёсць лек **АП-АП**, як што...*
Уладар уселясны паморшчыў твар, быццам прарок,
*Вачыма лес акінуў, **А** пасля зрок увысь узняў,*
Духу набраў, зубы адкрыў і... громка забрахаў!

(Ш)

З літар патоўшчаных слоў скласці рашэнне — прыказку — з першымі літарамі і іх лікам у паасобных адгадваемых словах: **П-2, А-7, А-7, А-1, П-2, З-5, С-6.**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 19 нумара

Асада, джаз, дзень, дом, жыта, зяць, кроў, ліха, міна, Надзея, пуць, рунь, станок, штаны.

Рашэнне: **Адзін дурань можа задаць столькі пытанняў, што дзесяць разумных не адкажа.** Кніжныя ўзнагароды высылаем: **Міхалу Байко** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

ISSN 0546-1960